«Звязда» адорвае падпісчыкаў!

СТАР. 3

Пост-драматычны «ТэАрт»

СТАР. 4

Гісторыя жыцця генерала

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СУБОТА № 201 (28059) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРАБЛЕМЫ ЛЕПШ ВЫРАШАЦЬ РАЗАМ

Парадак дня інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы

Учора ў Казахстане кіраўнікі дзяржаў СНД і ЕАЭС абмяркоўвалі актуальныя пытанні развіцця гэтых арганізацый. Удзел у абодвух самітах браў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Фота БЕЛТА.

На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў беларускі лідар заклікаў: «У СНД трэба брацца за абмеркаванне сур'ёзных праблем на постсавецкай прасторы і, наколькі гэта магчыма, стымуляваць тых, ад каго сёння залежыць іх вырашэнне. Не будзе гэтага — мы будзем ісці па нахільнай да згасання нашага супрацоўніцтва».

Садружнасць стане аўтарытэтнай і запатрабаванай, калі будзе вырашаць галоўныя, актуальныя пытанні, прадоўжыў Прэзідэнт і ў якасці прыкладу прывёў канфлікты ў Нагорным Карабаху, Прыднястроўі, Украіне. «Мы неяк нават сарамліва сыходзім ад гэтых пытанняў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы як быццам прывыклі, чакаем, што амерыканцы, Еўрасаюз, яшчэ хто прыедзе, і гэты «моцны дзядзька» нам скажа, у якім кірунку вырашаць гэтую праблему або вырашыць яе за нас».

З'явіліся новыя ўтварэнні на постсавецкай прасторы, дзе ёсць магчымасць больш глыбока абмяркоўваць існуючыя праблемы, лічыць Прэзідэнт. Гэта і Еўразійскі эканамічны саюз, і Саюзная дзяржава, найбольш прасунутая форма інтэграцыі, і АДКБ, і іншыя арганізацыі. «Асабліва мы ў апошні час зрабілі крэн на двухбаковых адносінах, аддалі фактычна ім прыярытэт. Гэта значыць, з'явілася вельмі шмат відавочных тэндэнцый на постсавецкай прасторы, якія штурхаюць нас да таго, што СНД трэба неадкладна прыстасаваць да рэалій сённяшняга дня», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнікі дэлегацый у ходзе пасяджэння ў вузкім фармаце павіншавалі Аляксандра Лукашэнку з перакананчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах і пажадалі яму поспехаў у адказнай дзейнасці. Прэзідэнт канстатаваў, што мінулыя прэзідэнцкія выбары былі цяжкай кампаніяй для Беларусі. Паводле яго слоў, было вельмі важна, як прагаласуюць беларусы пры такім моцным вонкавым уплыве. «Мы спрабавалі аднавіць адносіны з Еўрапейскім саюзам, адным з нашых асноўных гандлёва-эканамічных партнёраў. Я гэтага не ўтойваў: мы зрабілі ўсё, што папрасілі нашы партнёры. Пасля выбараў было пастаўлена пытанне, што далей, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Прыйшлося прызнаць, што ў Беларусі выбары прайшлі ў адпаведнасці нават з тымі стандартамі, якіх у нас няма, але якія ад нас патрабуюць пастаянна ў ААН, АБСЕ, ПАСЕ і іншых структурах». Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што падрабязна спыняецца на гэтым пытанні, паколькі нешта падобнае чакае пасля ўсе краіны СНД — «прыйдзецца вельмі карэктна даказваць сваю магчымасць кіраваць дзяржавай».

На ўчарашнім пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД было разгледжана 17 пытанняў. Лідары краін Садружнасці прынялі заявы ў сувязі з 70-годдзем стварэння ААН, аб барацьбе з міжнародным тэрарызмам, ухвалілі зварот у сувязі 30-й гадавінай аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Акрамя таго, быў зацверджаны пакет дакументаў, накіраваных на далейшае ўмацаванне ваеннага і прыгранічнага супрацоўніцтва, разгледжаны кадравыя пытанні. Падчас пасяджэння Аляксандр Лукашэнка ўручыў Прэзідэнту Казахстана Нурсултану Назарбаеву ордэн Дружбы народаў.

* * *

Аляксандр Лукашэнка правёў таксама сустрэчу з расійскім лідарам Уладзімірам Пуціным. На ёй абмяроўваліся надзённыя пытанні Саюзнай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў вызначыцца і канчаткова прыняць рашэнні па тых пытаннях, па якіх яны наспелі, або на пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета, або падчас яго візіту ў Маскву. Закранаючы супрацоўніцтва ў СНД, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі і Расіі супадаюць пункты гледжання па ўсіх пытаннях.

Уладзімір Пуцін у сваю чаргу яшчэ раз павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах і выказаў упэўненасць у працягу эфектыўнай сумеснай работы па ўдасканаленні механізмаў Саюзнай дзяржавы, у сферы эканомікі, узгаднення пазіцый на міжнароднай арэне, у сацыяльнай сферы.

СТАР. 2

ЗАЎЖДЫ НА ВЫШЫНІ

Менавіта так можна сказаць аб прафесіі электрамантажніка. Яна актуальная і запатрабаваная ў любую пару года і ў горадзе, і ў вёсцы. Напрыклад, лінейную брыгаду Шаркаўшчынскіх раённых электрасетак наш фотакарэспандэнт зняў за працай літаральна днямі — хлопцы праводзілі чарговы рамонт лініі. І на зямлі не скажаш, што цёпла, а ўверсе... «Нічога, работа ў нас такая», — весела адказвае Яўген ПАЛЯЛЕЙКА, спрытна ўпраўляючыся на сяміметровай вышыні.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

На Br100 трлн

прадалі харчовых тавараў арганізацыі гандлю краіны сёлета за студзень—жнівень, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У сярэднім за месяц насельніцтва купляла прадуктаў прыкладна на Br12,5 трлн, а ў разліку на душу насельніцтва прыпадала каля Br1,3 млн за месяц. Спажыўцы па-ранейшаму аддаюць перавагу харчовым таварам айчыннай вытворчасці. У першым паўгоддзі сярод рэалізаваных арганізацыямі гандлю харчовых тавараў айчынная прадукцыя складала 82,1%. Па шэрагу тавараў попыт пакупнікоў практычна цалкам задавальняецца за кошт прадукцыі беларускіх вытворцаў. Да такіх тавараў адносяцца яйкі (100%), масла (99,8%), цукар (99,6%), мяса і мясныя прадукты (99,5%).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.10.2015 г.

Долар ЗША	17194,00	▼
Еўра	19534,00	▼
Рас. руб.	280,00	▲
Укр. грыўня	807,99	▲

КАРОТКА

Ільготныя крэдыты на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў у Беларусі будуць выдзяляцца толькі па конкурсе.

У Беларусі бульба ўбрана з 95,5% уборачных плошчаў, накапана больш за 1,1 млн т з улікам фермерскіх гаспадарак, ураджайнасць у сельгасарганізацыях складае 220 ц/га.

Дазволеную скорасць на другой Мінскай кальцавой аўтадарозе (МКАД-2) да зімы плануецца знізіць да 70 км/г.

XII фестываль духоўнай музыкі «Залатагорская ліра» пройдзе ў Мінску 16-30 кастрычніка ў мінскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы (святога Роха).

Жаночая зборная Беларусі стала бронзавым прызёрам у камандной гонцы праследавання на чэмпіянаце Еўропы па трэкавых велагонках, які праходзіць у швейцарскім Грэнхене.

■ Выбары-2015

УСЁ ПАДЛІЧАНА ДАКЛАДНА

Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў пастанавіла, што выбары адбыліся. Пра гэта было аб'яўлена на ўчарашнім пасяджэнні ЦВК пасля аб'яўлення канчатковых вынікаў выбараў.

За Аляксандра Лукашэнку прагаласавалі 5 102 478 (83,5%), за Сяргея Гайдукевіча — 201 945 выбаршчыкаў (3,3%), Таццяна Караткевіч набрала 271 426 галасоў (4,44%), Мікалай Улаховіч — 102 131 (1,67%), супраць усіх кандыдатаў прагаласавала больш за 380 тысяч чалавек (6,3%). Каля 48,8 тысячы бюлетэняў прызнаны несапраўднымі.

— На падставе сказанага і ў адпаведнасці з артыкулам 82 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкулам 79 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў пастанаўляе: першае — прызнаць, што выбары Прэзідэнта адбыліся, другое — лічыць выбраным на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнка Аляксандра Рыгоравіча, — заявіў **Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі.**

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт таго, чаму да адных камісій ёсць прэтэнзіі, а да другіх — не, **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА** выказала думку, што розніца ў метадах працы.

— Цалкам магчыма, недзе старшыні ў нас не вельмі добра засвоілі тую навуку, якую давала Цэнтральная камісія, і ёсць пэўныя хібы, — адзначыла яна. — Я ўпэўнена, што кожны з іх імкнуўся зрабіць сваю працу шчыра і добрасумленна — гэта і з'яўляецца самым галоўным.

У адказ на пытанне, чым цяперашняя кампанія лепшая за папярэднія, Лідзія Ярмошына ў першую чаргу назвала тое, што кампанія была спакойнай. Таксама яна звярнула ўвагу на той факт, што сродкі масавай інфармацыі давалі роўныя магчымасці для ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты, а таксама на тое, што ў краіне прывіваюцца новыя тэхналогіі як інфармавання выбаршчыкаў, так і вядзення ўсёй агітацыйнай кампаніі.

— У нас нашмат больш ліберальны рэжым для здзяйснення працэсу вылучэння кандыдата ў Прэзідэнты, а пасля вядзення перадвыбарнай агітацыі і прапаганды, — дадала старшыня Цэнтрвыбаркама. — Думаю, гэта і ёсць тое пазітыўнае, негатыву я б не адзначыла ўвогуле.

Падчас размовы з прадстаўнікамі СМІ Лідзія Ярмошына паведаміла, калі ж пачнецца наступная выбарчая кампанія ў нашай краіне — па выбарах дэпутатаў ніжняй палаты Нацыянальнага сходу. Па яе словах, сама кампанія пачнецца ў чэрвені, выбары ж пройдуць у верасні наступнага года.

— Думаю, пасля Новага года мы адразу пачнём ствараць матэрыялы для парламенцкіх выбараў, — праінфармавала старшыня Цэнтральнай камісіі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ISSN 1990 - 763X

■ Грашовы калькулятар

КАШАЛЁК БЕЗ БАНКНОТ

Цяпер карткамі магчыма кіраваць і праз смартфон

Банкаўская картка сёння стала такім жа звычайным атрыбутам нашага жыцця, як мабільная сувязь ці грамадскі транспарт. Усе мы ў той ці іншай ступені карыстаемся імі ў паўсядзённым жыцці, нехта штодня, кансерватары — мінімальна. Актыўных карыстальнікаў прываблівае ў разліках «пластыкам» зручнасць, прастата і хуткасць разлікаў. Аднак песімісты часам справядліва ўказваюць на тое, што карткамі пакуль яшчэ не ўсюды можна разлічыцца, здараюцца збоі абсталявання ў крамах і крадзяжы грошай з рахунку. Што трэба абавязкова ведаць усім нам, каб «падарожжа» ў сістэму безнаяўных плацяжоў заўсёды было беспраблемным? Кансультантам рэдакцыі на гэту тэму стаў намеснік старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Аляксандр КУЧЫНСКІ.

«ПЛАСТЫК» З ФУНКЦЫЯЙ ДЭПАЗІТУ

Пры выбары тыпу карткі ўсё залежыць ад мэтаў, якія стаяць перад карыстальнікам. Магчыма, у вас ужо ёсць адна такая, выдадзеная ў рамках зарплатнага праекта. На яе прадпрыемства пералічвае аванс і заробак, ёю можна разлічвацца ў крамах, на транспарце, у кавярні і кінатэатры, а калі спатрэбіцца наяўныя грошы — здымаць іх у банкамаце.

Калі не хапае грошай на надзённыя патрэбы або буйную пакупку, можна афарміць крэдытную картку, асаблівасць якой у тым, што вы можаце распараджацца той сумай, якая знаходзіцца на ёй, у рамках адкрытай крэдытнай лініі. Карыстацца проста: калі набылі тавар у крэдыт, то неабходна своечасова яго пагашаць і не забываць выплачваць працэнты банку.

Цяпер шырока распаўсюджаны бонусныя карты (від крэдытных картак), якія прапануюць вяртанне на рахунак пэўнага працэнта патрачаных сродкаў, назапашванне балаў, якія можна выкарыстоўваць на куплю. Таксама плюсам такога пластыку з'яўляецца растэрміноўка вяртання пазыкі на некалькі месяцаў: пагадзіцеся, зручна купіць абутак або пыласос, а плаціць за іх невялікімі часткамі некалькі месяцаў, прычым без працэнтаў.

Банкаўская карта можа быць не толькі зручным інструментам разлікаў, але і сродкам зберажэння сваіх фінансаў. Сёння многія банкі выпускаюць зберагальныя карткі, якія выгадна спалучаюць у сабе атрыбуты дэпазіту, дзе на вашы грошы банк налічае нядрэнныя працэнты, і плацежнага кашалька, якім можна аплачваць тавары і паслугі. Плюсы такога спалучэння відавочныя, бо для зняцця грошай са звычайнага дэпазіту неабходна наведваць банк, які не адчынены кругласутачна, а калі спатрэбіцца вялікая сума, то грошы трэба заказваць за некалькі дзён. А вось для таго, каб зняць гатоўку са зберагальнай карткі, досыць візіту да звычайнага банкамата.

ВЫБІРАЕМ ПЛАЦЕЖНУЮ СІСТЭМУ

Тут існуе два варыянты: нацыянальную ці міжнародную. Калі вы не плануеце выязджаць за межы Беларусі, то будзе дастаткова і «Белкарт». Пры наведванні іншай краіны трэба мець картку сістэмы Visa або Master Card. Звярніце ўвагу, што за мяжой больш выгадна будзе расплачвацца карткай, намінаванай у замежнай валюце. Можна выкарыстоўваць і рублёвую, але тады пры аплаце будзе праходзіць абмен рублёў на валюту той краіны, дзе праходзіць плацеж.

З рахунку спішацца прыкладны рублёвы эквівалент сумы, а канчатковы разлік можа адбыцца праз некалькі дзён па курсе на момант завяршэння аперацыі. Зразумела, што пры паездцы ў Еўропу лепш завесці картку ў еўра, пры падарожжы ў ЗША — у доларах, каб пры аплаце не ажыццяўлялася дадатковая канвертацыя адной валюты ў другую.

ЗА КАМФОРТ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ ДАДАТКОВА

Фінансавыя ўстановы часам прапануюць сваім кліентам прэміяльныя банкаўскія карткі. Шараговы карыстальнік навряд ці адчуе розніцу пры аплаце імі пакупак у краме, бо такія карткі даюць перавагі свайму ўладальніку пры пражыванні ў гасцініцы, арэндзе аўтамабіля, аплаце авіябілетаў і ў іншых выпадках, звязаных з камфортам. Напрыклад, прэміяльны «пластык» можа прадугледжваць бясплатнае карыстанне VIP-залай у аэрапорце.

Але трэба заўважыць, што кожны сэрвіс каштуе грошай, таму гадавое абслугоўванне прэміяльных картак будзе істотна даражэйшым, чым Visa Classic або Mastercard Electronic.

СТАР. 2

ПРАБЛЕМЫ ЛЕПШ ВЫРАШАЦЬ РАЗАМ

***

Учора ж у пасёлку Бурабай Акмалінскай вобласці Казахстана адбылося пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, на якім старшынстваваў Прэзідэнт Беларусі.

Падводзячы вынікі гэтага саміту, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на пасяджэнні ў вузкім складзе было прынята рашэнне, што Расія і Казахстан вельмі сур'ёзна папрацуюць на мяжы з Кыргызстанам і зробяць максімум, каб народ гэтай краіны адчуў, якую карысць ён мае ад ЕАЭС. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што гэта прынясе вялікую карысць Кыргызстану, у тым ліку па пастаўках на агульны рынак мясной прадукцыі і іншых тавараў.

Парадак дня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ўключаў 15 пытанняў, і ўсе яны былі разгледжаны на пасяджэнні ў вузкім складзе, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Так, было прынята рашэнне, што з 1 лютага 2016 года ў Еўразійскай эканамічнай камісіі будзе старшынстваваць Арменія, а яе былы прэм'ер-міністр Тыгран Саркісян узначаліць ЕЭК.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ўдзельнікі пасяджэння выйшлі за межы парадку дня, звярнуўшыся да надзённых тэм развіцця ЕАЭС.

На выніках саміту кіраўнікі дзяржаў — членаў савета падпісалі шэраг дакументаў, якія вызначаюць парадак узаемадзеяння ЕАЭС і ЕЭК з трэцімі краінамі. Акрамя таго, у Бурабаі быў прыняты пакет дакументаў па імплементацыі ў нормы ЕАЭС абавязацельстваў, прынятых Казахстанам пры ўступленні ў СГА, было вырашана пачаць афіцыйныя перамовы па пагадненні аб свабодным гандлі з Ізраілем, запусціць працу з Кітайскай Народнай Рэспублікай па фарміраванні гандлёва-эканамічнага пагаднення. Наступнае пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета адбудзецца ў снежні ў Маскве.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

УРАД БЕЛАРУСІ СКЛАЎ СВАЕ ПАЎНАМОЦТВЫ

Урад краіны прыняў рашэнне аб складанні паўнамоцтваў перад зноў абраным Прэзідэнтам. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў №870 ад 16 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Складанне паўнамоцтваў перад зноў абраным Прэзідэнтам прадугледжана артыкулам 106 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкулам 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь».

Пастанова ўступае ў сілу з дня яе прыняцця.

ЭКСПЕРТЫ КАНСТАТАВАЛІ ПОСПЕХ

Напярэдадні ў сталіцы завяршылася 79-я Генеральная асамблея Міжнароднай электратэхнічнай камісіі, падчас якой на некалькі дзён Мінск сабраў больш за 1200 экспертаў з усяго свету. Прадстаўнікі розных краін адзначылі высокі ўзровень падрыхтоўкі, а таксама ацанілі Беларусь як партнёра, які развіваецца і мае вялікія перспектывы ўжо ў найбліжэйшай будучыні.

МАГЧЫМАСЦЬ ПРАДЭМАНСТРАВАЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ

Размаўляючы з некаторымі гасцямі форуму, можна было пачуць шмат падзяк у бок арганізатараў Генасамблеі гэтага года. Таксама гасцям спадабалася наша сталіца. **Прэзідэнт паўднёвакарэйскай кампаніі па выпрабаваннях і сертыфікацыі Кафонг ЧОІ** расказаў, што калі ён упершыню прыбыў у Мінск, то змог асабіста ўбачыць вялікі патэнцыял беларускага боку.

«Беларусь — краіна з добра арганізаванай інфраструктурай. Генеральная асамблея павінна дапамагчы вам заявіць пра сябе яшчэ гучней. Для Беларусі 79-я Генасамблея — гэта вялікая падзея! Для дасягнення эканамічнага росту цяпер патрэбны інструменты, якімі сёння з'яўляюцца стандарты. Яны аблягчаюць працэдуры гандлю, а таксама забяспечваюць бяспеку і абараняюць навакольнае асяроддзе», — адзначыў Кафонг Чоі.

Згодна з яго словамі, Генасамблея з'яўляецца важнай матывацыяй, якая павінна быць фактарам, што стымулюе эканамічны рост.

«Вы толькі ўявіце, што тут сабраліся больш за 1000 дэлегатаў з усяго свету! У мінулым краіны імкнуліся да экспансіі. Цяпер мы цывілізавана пашыраем сваю тэрыторыю за кошт стварэння партнёрскіх сетак. Гэтая асамблея — магчымасць для вас прадэманстраваць свой патэнцыял да эканамічнага росту і вашы намеры гарманізавацца з сусветнымі стандартамі. З пункту гледжання карэйскага досведу, з тых урокаў, што мы атрымалі, вы не павінны ізалявацца ад сусветнай супольнасці. Вы ва ўмовах глабальнага рынку. Гэта азначае, што вашы сістэмы павінны быць гарманізаваны з глабальнымі», — падкрэсліў прадстаўнік Паўднёвай Карэі.

Дарэчы, у Карэі 97% стандартаў ужо гарманізаваны з сусветнымі. У Беларусі працэнт крыху меншы — 74%. Для Карэі гэта азначае, што кожны год яе кампаніі вырабляюць прадукцыю, якая можа без праблем пастаўляцца на сусветны рынак.

«У гэтым мерапрыемстве Беларусь, як ніколі раней, наблізілася да таго, каб уплываць на стварэнне інструментаў, дзякуючы якім адбываецца канкурэнцыя на глабальным рынку. Яна змагла сярод роўных прапанаваць сваё бачанне і свае стандарты», — выказаў сваю думку Кафонг Чоі.

СВАБОДНА ГАВАРЫЦЬ З ТЫМІ, ДА КАГО ЦЯЖКА ДАБРАЦЦА

Прадстаўнік амерыканскай кампаніі ў сферы прамысловай аўтаматызацыі і інфармацыі Цім ДАФІ быў таксама ўражаны падрыхтоўкай Генеральнай асамблеей і тым, як яна выдатна праходзіла.

«Я бачу перспектывы развіцця Беларусі ў МЭК. Правядзенне мерапрыемства на сваёй тэрыторыі — гэта своеасаблівая дэманстрацыя ўнёску краіны ў саму арганізацыю. Я чуў ад розных экспертаў, што пасяджэнні камітэтаў і падкамітэтаў прайшлі дастаткова добра. У гэтым я згодны з імі. Вельмі важна, што мы змаглі сабраць прадстаўнікоў усяго свету ў адным месцы. Для ЗША гэта таксама вельмі вялікая перавага, бо на такой глабальнай платформе мы можам дамовіцца з прадстаўнікамі розных краін і знайсці агульнае вырашэнне многіх пытанняў. Гэта таксама магчымасць сустрэцца з тымі краінамі, якія цяжка наведаць у любы іншы час», — растлумачыў прадстаўнік ЗША.

Таксама ён адзначыў, што асноўная перавага, якую атрымліваюць распрацоўшчыкі стандартаў, — гэта магчымасць уплываць на развіццё глабальнага рынку.

«Для прадпрыемстваў вашай краіны гэта ўнікальная магчымасць здабыць новыя сувязі, якія ў далейшым змогуць прасунуць вашу прадукцыю», — сказаў Цім Дафі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

ВАС ПРЫМЕ МАМОЛАГ

Месяц барацьбы з ракам малочнай залозы працягваецца. Ва ўсіх рэгіёнах праводзяцца тэматычныя лекцыі, выступленні медыкаў. У цэнтры анкалогіі 17 і 24 кастрычніка можна бясплатна, па папярэднім электронным запісе, трапіць на прыём да ўрача-мамолага і прайсці пры неабходнасці мамаграфію або ўльтрагукавое даследаванне.

Гэта будзе даступна таксама 28-29 кастрычніка з 9.00 да 15.00 ва ўсіх гарадскіх, цэнтральных раённых паліклініках сталіцы і мінскім онкадыспансеры. У гэтым выпадку папярэдні запіс не патрабуецца.

У 20 працэнтах выпадкаў рак малочнай залозы выяўляецца ў нашай краіне на позніх, 3-й і 4-й, стадыях. Галоўным чынам захворванне заяўляе аб сабе ва ўзросце пасля 50 гадоў. Самыя першыя змены можна разгледзець толькі падчас мамалагічнага даследавання. І толькі такое, самае ранняе, выяўленне захворвання дазваляе дабіцца добрага выніку лячэння, кажа галоўны пазаштатны мамолаг Міністэрства аховы здароўя, загадчыца лабараторыі рэканструктыўна-аднаўленчай хірургіі і онкамамалогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Яўгенія ШАПАВАЛ.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

КАШАЛЁК БЕЗ БАНКНОТ

СМАРТ-КАРТЫ

У дадатак да традыцыйных банкаўскіх картак з магнітнай паласой, на якой запісваецца інфармацыя аб рахунку, усё больш шырокае распаўсюджанне атрымліваюць так званыя смарт-карты. У іх інфармацыя запісваецца на спецыяльным чыпе, больш устойлівым да спроб узлому з боку махляроў. Многія карыстальнікі ацанілі перавагі і бескантактных картак: для таго, каб здзейсніць аплату, дастаткова проста дакрануцца ёю да тэрмінала. З ёй пры куплі на суму да 200 тысяч рублёў не трэба ўводзіць ПІН-код або падпісваць чэк.

НУМАР — НІКОМУ

Сёння яшчэ дастаткова людзей, хто карыстаецца банкаўскай карткай ўсяго 2 разы на месяц — калі здымае з яе аванс і заробак у банкамаце. Актыўнае карыстанне безнаяўным кашальком у іх звязана са страхам зрабіць якую-небудзь памылку або промах і ў выніку страціць грошы. Каб развеяць падобныя страхі, наш эксперт падрыхтаваў некалькі парад.

Пасля правядзення аперацыі ў банкамаце ці інфакіёску не забывайце там картку. Нельга перадаваць сваю картку трэцім асобам, напрыклад, пры аплаце ў кавярні або ў краме. Не паведамляйце налева і направа нумары сваіх картак, нават калі хочацца выкласці ў «Інстаграм» фота сваёй «залатой» або «плацінавай» карткі.

Для таго, каб ведаць пра ўсе аперацыі, якія ажыццяўляюцца з выкарыстаннем карткі, падключыце sms-апавяшчэнне або sms-банкінг: у гэтым выпадку адразу пасля плацяжу на ваш тэлефон прыйдзе паведамленне з указаннем расходнай аперацыі. Звяртайце ўвагу на знешні выгляд банкамата: ці няма накладак на яго клавіятуры або старонніх прадметаў у карткапрыёмніку. За мяжой лепш здымаць грошы не ў вулічных банкаматах, а ў банках або гатэлях. Будзьце асцярожнымі пры зняцці наяўных грошай і аплаце карткамі ў краінах з высокім узроўнем рызыкі махлярства — сярод іх эксперты згадваюць Украіну, Расію (у прыватнасці Маскву і Санкт-Пецярбург), Балгарыю, Егіпет, Турцыю, Тайланд і Мексіку.

МАХЛЯРОЎ БУДЗЕ ШУКАЦЬ БАНК

Для таго, каб кліенты не пацярпелі ад махлярскіх аперацый, сёлета беларускія банкі абавязалі прытрымлівацца прынцыпу нулявой адказнасці трымальніка картак. Гэта азначае, што калі вы сталі ахвярай махляроў, якія скралі грошы з картачнага рахунку, банк правядзе расследаванне і верне іх вам. Для гэтага ўладальнік карткі павінен на працягу 30 каляндарных дзён звярнуцца з пісьмовай заявай у банк (у выпадку форс-мажорных абставін тэрміны карэктуюцца). Банку даецца 45 альбо 90 дзён для вяртання сродкаў у залежнасці ад таго, дзе адбыўся крадзеж — у Беларусі ці за мяжой. Але трэба разумець, што сродкі не вернуць, калі былі парушаны тэрміны падачы заявы або банк высветліць, што мела месца махлярства з боку кліента.

БЯСПЕЧНЫ АНЛАЙН

Для людзей сярэдняга пакалення, хто раней актыўна не карыстаўся банкаўскімі карткамі, адным з матываў завесці «пластык» з'яўляецца магчымасць з яго дапамогай аплачваць пакупкі ў інтэрнэт-крамах — беларускіх і замежных. Як не страціць свае грошы, робячы анлайн-плацяжы?

Найбольш просты тып карткі для разлікаў у інтэрнэце — віртуальная, лічыць наш эксперт. У рэальнасці яе не існуе, бо кліенту проста паведамляюць нумар карткі, коды CVC2 або CVV2, якія неабходна ўводзіць пры аплаце. У выпадку з віртуальнай карткай няма страху яе згубіць, бо яе няма ў рэальнасці (трэба дадаць, што некаторыя банкі ідуць насустрач кліентам і выпускаюць «пластык» да такога тыпу картак. — **Рэд.**).

Для пакупак у інтэрнэт-крамах падыдуць і звычайныя карткі, галоўнае, прытрымлівацца некалькіх простых правілаў. Аплачвайце пакупкі ў крамах, якія выклікаюць давер, маюць станоўчыя водгукі карыстальнікаў, даюць магчымасць зваротнай сувязі. Сачыце, каб аплата праходзіла на абароненай старонцы: пра тое, што вы на яе трапілі, сведчыць прэфікс «https» у адрасным радку, надпіс «бяспечны» або значок-замочак (у залежнасці ад піта вашага браўзара). Эксперты раяць лепш завесці для інтэрнэт-плацяжоў асобную картку, якую вы будзеце папаўняць толькі перад аплатай і дзе не станеце трымаць асноўнай сумы сваіх зберажэнняў. Калі на рахунку такой карткі няма сур'ёзных грошай, то і ашуканцы нічым не змогуць з яе пажывіцца.

Адзін акаўнт для ўсіх картак

Гэтымі днямі кампанія velcom афіцыйна запусціла новую ўніверсальную фінансавую праграму V-banking, якая дазваляе аб'яднаць у адзін акаўнт аперацыі з усімі сваімі банкаўскімі карткамі і кіраваць імі з уласнага смартфона. Упершыню навінка была прадстаўлена наведвальнікам найбуйнейшай у Беларусі тэхналагічнай выставы «TIBO-2015». Сёння гэтая праграма даступная для ўсіх Android-карыстальнікаў.

Паводле інфармацыі аддзела карпаратыўных камунікацый прадпрыемства «Велком», цікавасць да прадукту абумоўлена яго ўніверсальнасцю — сэрвіс V-banking адкрывае шырокія магчымасці для абанентаў розных мабільных аператараў. З дапамогай гэтай мабільнай праграмы яны змогуць выконваць адразу некалькі новых функцый.

Першая тычыцца пераводу грошай з карткі на картку карыстальніка V-banking, з выкарыстаннем нумароў тэлефона з запісной кніжкі. Гэтая аперацыя ажыццяўляецца на любы «пластык» кліента, незалежна ад таго, які банк іх выпусціў і з карткі якога банка ажыццяўляецца перавод.

Наступная функцыя дазваляе аплочваць розныя паслугі (тавары) у сістэме АРІП, што аўтаматычна выключае для кліента нават верагоднасць стаяння ў чэргах у аддзяленнях банкаў і пошты. Больш за тое, цяпер выконваць аперацыі па любой з картак, што ўключаны ў акаўнт, магчыма ў тым месцы і ў той час, калі гэта будзе зручна кліенту.

Акрамя таго, у праграме V-banking карыстальнік можа запусціць опцыю аўтаматычных плацяжоў, каб штомесячныя стандартныя аперацыі заўсёды выконваліся дакладна ў тэрмін. Карыснай будзе і функцыя атрымання справаздач аб выкананых аперацыях: з ёй магчыма кантраляваць рух фінансавых сродкаў адразу па ўсіх сваіх актыўных банкаўскіх картках.

Цяпер скарыстацца бясплатнай праграмай V-banking могуць трымальнікі картак міжнародных плацежных сістэм VISA і Master Card усіх банкаў Беларусі.

БЕЗНАЯЎНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ Ў ТРЭНДЗЕ

Плацежная сістэма «БелКарт» правяла апытанне, мэтай якога было высветліць асаблівасці «безнаяўнага жыцця» беларусаў.

Вынікі паказалі, што пры выбары дадатковай карткі, напрыклад, крэдытнай або зберагальнай, для большай часткі рэспандэнтаў найважнейшым фактарам з'яўляецца кошт абслугоўвання карткі (56,2%). Нязначны працэнт апытаных выбірае дадатковыя карткі, зыходзячы з таго, ці ёсць на ёй чып або які ў карткі статус ці дызайн.

Трэба адзначыць, што ўсё больш беларусаў аддае перавагу аплаце за паслугі і тавары менавіта карткай, а не здыманню ўсёй зарплаты. Толькі 15,6% карыстальнікаў дагэтуль здымаюць увесь заробак цалкам.

У якасці дадатковай матывацыі больш актыўнага выкарыстоўвання картак пры разліках, 27% рэспандэнтаў гатовыя расплачвацца безнаяўна, калі па картках будуць прадастаўлены зніжкі, бонусы або падарункі. Для 24,1% апытаных важная прысутнасць у гандлёвым пункце дастатковай колькасці тэрміналаў. Крыху менш, але ўсё ж такі важным фактарам для апытаных з'яўляюцца дадатковыя магчымасці інтэрнэт-банкінгу: пераводы грошай на карткі розных банкаў праз інтэрнэт-банкінг і аплата праз інтэрнэт-банкінг крэдытаў іншых банкаў.

Акрамя вышэйпералічанага, трымальнікам цікавыя функцыі кэш-бэка (вяртання часткі выдаткаваных сродкаў), налічэнне працэнта на рэшту па рахунку, а таксама паляпшэнне якасці самаго «пластыку». Самымі папулярнымі сродкамі ДБА (дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання) сярод беларусаў з'яўляюцца інтэрнэт-банкінг і інфакіёск. Мабільным банкінгам карыстаюцца 9,7% апытаных, а SMS-банкінгам — 6,3%.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Погляд

НАПАЧАТКУ БЫЛА ДУМКА

Аб ролі экспертнай супольнасці ў жыцці грамадства

Вядомы брытанскі эканаміст Джон Мэйнард Кейнс (эканамічныя погляды якога я, дарэчы, не падзяляю) яшчэ ў 1935 годзе пісаў: «Ідэі эканамістаў і палітычных філосафаў, і калі яны маюць рацыю, і калі памыляюцца, маюць значна большы ўплыў, чым прынята думаць. На самой справе, мала што яшчэ кіруе светам».

У цэлым з гэтай цытатай Кейнса цяжка не пагадзіцца, асабліва калі паглядзець на развіццё краін і ўсяго чалавецтва з гістарычнай перспектывы. Думаю, мала хто будзе спрачацца з простым тэзісам пра тое, што моц і магчымасці краіны ў вялікай ступені вызначаюцца яе інтэлектуальным патэнцыялам. Іншымі словамі, якасцю грамадскай думкі і інтэлектуальных эліт.

А адзін са складнікаў інтэлектуальнай і ідэйнай прасторы краіны — гэта яе экспертная супольнасць. Тэрмін распаўсюджаны, але ж, магчыма, не для ўсіх зразумелы. Таму патлумачу.

Пад экспертнай супольнасцю маецца на ўвазе асяроддзе, у якім генерыруюцца ідэі па розных накірунках дзейнасці. У прыватнасці, часта гэта паняцце прымяняецца да сукупнасці людзей, якія валодаюць глыбокімі прафесійнымі ведамі ў галінах дзяржаўнага кіравання. Эксперты — гэта і вучоныя, і прадстаўнікі даследчых інстытутаў і аналітычных цэнтраў, і проста незалежныя (г.зн. не звязаныя з нейкай арганізацыяй) спецыялісты. Але ж не супрацоўнікі дзяржаўных органаў, бо для эксперта важна быць па-за межамі карпаратыўных і палітычных інтарэсаў асобных інстытутаў ці груп.

Роля экспертаў, як і інтэлектуалаў у больш шырокім сэнсе, — быць стрыжнем грамадскай думкі, забяспечваць пераемнасць ведаў і іх суаднясенне з нацыянальнымі інтарэсамі краіны. Экспертная супольнасць і мусіць адказваць за «намацванне» і абгрунтаванне нацыянальных інтарэсаў і іх тлумачэнне грамадству. Яна з'яўляецца мостам паміж рэальнай палітыкай, дзяржаўным кіраваннем і грамадствам.

Дабаўленая вартасць экспертнай супольнасці не толькі ў непасрэдных прафесійных ведах, а яшчэ і ў доступе да экспертных сетак у іншых краінах. А гэта і доступ да ведаў, якіх бракуе ў сваёй краіне, да так званых «ноу-хау». Гэта і магчымасць даносіць і тлумачыць праз экспертныя каналы інтарэсы сваёй краіны іншым грамадствам ці нават урадам. У тэорыі і практыцы міжнародных адносін нават існуе адмысловае паняцце — «другая каляіна дыпламатыі» (track-II diplomacy), то бок экспертная дыпламатыя, якая адыгрывае карысную ролю ў міждзяржаўных стасунках.

Асабліва важную ролю экспертная супольнасць мае ў крызісныя часы, калі звычайны лад грамадскага жыцця парушаецца і з'яўляецца ідэйны вакуум адносна таго, як жыць далей.

А як выглядае гэты стрыжань грамадскай думкі ў Беларусі?

Пытанне не тэарэтычнае, а абсалютна практычнае, прыкладное. Наша краіна сутыкнулася сёння з сур'ёзнымі выклікамі, найперш у эканоміцы і знешняй палітыцы. У такіх умовах роля экспертнай супольнасці якраз і становіцца вызначальнай. І менавіта такія часы з'яўляюцца тэстам на якасць экспертнай супольнасці.

На жаль, існуючая сёння ў Беларусі эканамічная і знешнепалітычная дыскусія сведчыць пра тое, што з экспертнай супольнасцю ў нас не ўсё добра.

Прытым у знешнепалітычным кантэксце сітуацыя крыху лепшая. Можна нават канстатаваць, што ў апошнія гады тут назіраецца пэўны прагрэс. З'яўляюцца новыя арганізацыі і аналітыкі, пачынае вымалёўвацца некаторая змястоўная экспертная дыскусія. Хоць якасць і ўзровень застаюцца нізкімі.

Дастаткова паслухаць гэтыя дыскусіі ці пачытаць некаторыя публікацыі, каб пабачыць праблемы: дрэннае валоданне сучаснымі і класічнымі тэорыямі міжнародных адносін, яшчэ горшае разуменне рэальнай палітыкі і ўмоў, у якіх яна рэалізуецца. Не дзіўна, што шматлікія дыскусіі і экспертныя думкі проста кішаць канспіралогіяй і так званымі «тэорыямі змовы». А гэта першы паказчык нізкай якасці: той, хто не разумее рэальных працэсаў і не ў стане ў іх разабрацца, звычайна і схільны да канспіралагічных фантазій.

Назіраецца і распаўсюджаная праблема з метадалогіяй — а гэта святая святых у працы эксперта. За апошні час у публічнай прасторы з'явілася шмат так званых «экспертных дакладаў», якія базіруюцца на ўсё тых жа канспіралагічных фантазіях аўтараў і шматлікіх спасылках на розныя чуткі, што быццам ходзяць то ў дыпламатычным, то нейкім іншым асяроддзі. Такая якасць даследчай метадалогіі — гэта сорам. А карысць ад гэтых экспертных дакладаў, у лепшым выпадку, нулявая.

Але ж, як падаецца, у эканоміцы ўсё яшчэ горш.

У эканамічных дыскусіях у Беларусі часцей за ўсё можна пачуць ці нейкую заідэалагізаванасць савецкіх часоў, ці проста банальную прафесійную непрыдатнасць. У нашых акадэмічных часопісах па эканоміцы большасць матэрыялаў узроўню магістратуры не самага лепшага еўрапейскага ВНУ. Ёсць, вядома, і выключэнні, але іх няшмат. Наша эканамічная думка адстае ад сусветнай, як мінімум, гадоў на дзесяць.

У гэтай сітуацыі і не дзіўна, што падчас дыскусіі пра будучыню беларускай эканомікі на адным з тэлеканалаў вядомы доктар эканамічных навук на поўным сур'ёзе сказаў, што ўсе нашы праблемы вырашацца, калі мы зробім больш гнуткай сістэму заробкаў для кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў. Думаю, не трэба нагадваць, што гэтая «геніяльная» думка яшчэ з часоў савецкай перабудовы. Але тады, у тым ліку для вучоных, існавала «жалезная заслона», якая адгароджвала іх ад сусветных навуковых працэсаў. Якая і дзе заслона існуе сёння — незразумела…

Пры ўсім пры тым ёсць жа ў нас шмат добра адукаваных эканамістаў, ёсць беларусы-эканамісты, якія працуюць на сур'ёзным узроўні ў замежных універсітэтах і даследчых цэнтрах. Але ж іх велізарны патэнцыял не выкарыстоўваецца.

У гэтым і ёсць галоўная праблема нашай экспертнай супольнасці — у яе ізаляванасці як ад міжнародных суполак, так і ад працэсу прыняцця рэальных кіраўнічых рашэнняў унутры Беларусі.

Праблему трэба вырашаць, бо ўрэшце гэта пытанне нацыянальнай бяспекі. Неабходна па-новаму паглядзець на камунікацыю паміж дзяржавай і экспертнай супольнасцю. А для гэтага патрэбны якасныя дыскусійныя і даследчыя пляцоўкі. Падкрэслю: менавіта якасныя, адпаведныя самым высокім міжнародным стандартам ці, прынамсі, якія імкнуцца да такіх стандартаў.

Яўген ПРЭЙГЕРМАН, дырэктар па даследаваннях грамадскага аб'яднання «Дыскусійна-аналітычная супольнасць «Ліберальны клуб».

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**ЛОТ № 1** Бульдозер Б-170 желтого цвета, 1995 г.в., начальная стоимость 199 385 000 рублей. **ЛОТ № 2** Автокран на базе а/м Краз-250, 1993 г.в., р.з. ВВ0941, начальная стоимость 57 835 000 рублей. **ЛОТ № 3** Штукатурная станция 2009 г.в., начальная стоимость 39 360 000 рублей. **ЛОТ № 4** Перфоратор MKITA 2008 г.в., начальная стоимость 2 204 000 рублей. **ЛОТ № 5** Бетоносмеситель 2008 г.в., начальная стоимость 4 232 000 рублей. **ЛОТ № 6** Вибромашина HRC90w, начальная стоимость 4 967 000 рублей
Собственник (владелец) имущества	Производственное унитарное частное предприятие «Друць»
Местонахождение имущества	Витебская область, г. Толочин, ул. Мелиораторов, 1А. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ПЧУП «Друць», Роговскому Николаю Николаевичу, 8-029-622-37-24
Наличие обременений	Не имеются
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения Толочинского района, г. Толочин, Витебской области, ул. Гоголя, д. 69, каб. 2, 26.10.2015 года в 10.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения Толочинского района, 211092, г. Толочин, ул. Энгельса, 16А. Судебный исполнитель Голубцов Андрей Александрович, тел. 8-02136-2-15-37. Начальник отдела Лисецкая Татьяна Федоровна, тел. 8-02136-2-21-22
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения Толочинского района № 3642903009896, УНП 300002505, в ЦБУ 219 в г. Толочин ф-ла 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Толочин **не позднее 23.10.2015 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 года «232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим АЛЕКСЕЕВА Николая Алексеевича, 6 января 1922 года рождения. Согласно информации Центрального архива Министерства обороны РФ, красноармеец Алексеев Н.А., родившийся в г. Речице Гомельской области в 1922 году, пропал без вести в 1941 году.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2 месяцев со дня публикации имеющиеся сведения об Алексееве Николае Алексеевиче.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»

опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:

«...стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир, площадью **40,68 кв.м**, на 7-м этаже – **1300 (одна тысяча триста) долларов США**».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел.: 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.

УНП 191061436

ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

ОАО «Евроторгинвестбанк»
www.etib.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 01.10.2015 г.	на 01.10.2014 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		41 581	18 444
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		12 752	28 958
5	Средства в банках	1104		262 703	20 105
6	Ценные бумаги	1105		-	20 162
7	Кредиты клиентам	1106		540 833	227 487
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		21 639	13 396
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	-
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		5 389	64 960
14	**ИТОГО активы**	**11**		**884 897**	**393 512**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	-
17	Средства банков	1202		177 869	53 880
18	Средства клиентов	1203		155 713	169 956
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		84 260	10 258
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		3 533	601
23	ВСЕГО обязательства	120		421 375	234 695
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		430 000	139 916
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		4 664	4 308
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		2 064	2 170
29	Накопленная прибыль	1215		26 794	12 423
30	ВСЕГО капитал	121		463 522	158 817
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**884 897**	**393 512**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 01.10.2015 г.	на 01.10.2014 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		122 364	64 458
2	Процентные расходы	2012		32 485	28 687
3	Чистые процентные доходы	201		89 879	35 771
4	Комиссионные доходы	2021		24 277	19 519
5	Комиссионные расходы	2022		2 251	1 187
6	Чистые комиссионные доходы	202		22 026	18 332
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(3 913)	(114)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		45 406	6 149
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(2 136)	11
11	Чистые отчисления в резервы	207		55 812	25 644
12	Прочие доходы	208		12 364	16 152
13	Операционные расходы	209		67 520	38 356
14	Прочие расходы	210		18 325	1 439
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		21 969	10 862
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		5 634	2 031
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**16 335**	**8 831**

Председатель Правления В.А. Драгун

И.о. главного бухгалтера С.Л. Силицкая

Дата подписания 13 октября 2015 г.

Лицензия ОАО «Евроторгинвестбанк» № 26 от 28.05.2013 г. УНП 807000043.

«КАБ МАМА МНОЙ ГАНАРЫЛАСЯ...»

15 кастрычніка ва ўсім свеце адзначалі дзень сельскіх жанчын. У нас галоўнае рэспубліканскае мерапрыемства зладзілі гэтым днём у санаторыі «Спадарожнік», запрасіўшы на яго матуль з Мядзельскага раёна разам з іх таленавітымі дзецьмі, якімі ганарацца і іх сем'і, і краіна.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ала Мацюшонак з вёскі Будслаў працавала ўсё жыццё санітаркай у доме-інтэрнаце, муж быў шафёрам. Жылі проста, але ладна. Жанчына прызнаецца, што самы вялікі скарб яе жыцця — дзеці. На мерапрыемства яна прыйшла з сынам Андрэем, студэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэатам міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.

— Многія казалі, што мне, простаму хлопцу, будзе складана выйсці «з вёскі ў свет», але я нікога не слухаў і верыў у свае сілы, — прызнаецца Андрэй. — Цяпер сумяшчаю вучобу з выступленнямі ў сімфанічным аркестры Маладзечанскага музычнага каледжа. Я абавязкова заваюю новыя вяршыні, каб маці ганарылася мной яшчэ больш.

На свята завіталі і прыгажуні з сям'і Лапцік: маці Ірына і дачушка Алена. Бацькі ўжо не першы год цешацца са спартыўных перамог дзяўчыны. З апошніх узнагарод — «бронза» на чэмпіянаце Еўропы па веславанні на байдарках і каноэ.

— Алена ў нас з маленства жвавая ды рухомая: зімой на лыжах каталася, летам з вады было не выцягнуць. Вось такое вясковае дзяцінства, усё на прыродзе. Затое якая спартсменка вырасла! — з гонарам гаворыць Ірына Пятроўна.

Ганарыцца сваім сынам і Серафіма Шабовіч з вёскі Бадзені. Ён дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства БДПУ ім. М. Танка, кандыдат філалагічных навук, паэт. Для ўсіх — Мікалай Шабовіч, для маці — проста Міколка.

— Маці для мяне — самы дарагі чалавек; самае роднае, светлае, святое слова. Яе пяшчоту і любоў адчуваў заўсёды і, дзякаваць Богу, адчуваю сёння — ніхто так не падтрымае ў жыцці, як маці, — гаворыць Мікалай.

Міністр працы і сацыяльнай абароны, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Марыяна ШЧОТКІНА адзначыла:

— Сям'я — аснова нашай краіны. Шэсць гадоў таму ў Беларусі было 69 тысячы шматдзетных сем'яў, сёння лічбы выраслі да 77 тысяч. Многія з бацькоў прызнаюцца, што хочуць ужо не адно дзіця, а дваіх і траіх. Гэта цудоўна! Мы іх падтрымаем.

Сёння мы выканалі ўсе паказчыкі, якія былі закладзены ў праграму дэмаграфічнай бяспекі за 2010-2015 гады. А ўсё таму, што рэалізоўвалі яе не толькі міністэрствы, але і грамадскія аб'яднанні. Не варта забываць аб тым, што ў нашай краіне ўсё пабудавана на ўзаемадзеянні.

Узаемадзеянне і супрацоўніцтва адчуваліся і зараз. Бо зладзілі «сяброўскую сустрэчу» дзяржаўнае аддзяленне «Сялянка» (Беларускага саюза жанчын) і Мядзельскі раённы выканаўчы камітэт.

Ураджэнка гэтых прыгожых мясцін, старшыня «Сялянкі» і галоўны арганізатар свята Рэгіна Давідовіч таксама выказала падзяку ўсім таленавітым сем'ям за тое, што ўносяць годны і значны ўклад у развіццё нашай краіны.

Хрысціна ХІЛЬКО.

■ Падпіска-2015

СА «ЗВЯЗДОЙ» СПАДРУЧНЕЙ? І САПРАЎДЫ!

На жаль, нямногія з нашых, нават самых адданых, чытачоў пішуць лісты ў рубрыку «Я зноў выбіраю «Звязду». Яшчэ менш тых, хто выбраўшы — аформіўшы падпіску на паўгоддзе ці квартал, — дасылаюць потым карткі на розыгрыш прызоў.

Але ж, як сведчыць рэдакцыйная пошта, ёсць у газеты падпісчыкі, якія робяць гэта заўсёды: ні разу не прапусціўшы і пры гэтым, як ні крыўдна прызнацца, не выйграўшы!

А ёсць, як высвятляецца, наадварот...

— Колькі гадоў выпісваем «Звязду», я, шчыра кажучы, ужо не помню. Такое ўражанне, што ўсё жыццё, — прызналася **спадарыня Таццяна ГАРАЛЬЧУК з Мінска**. — Прынамсі, карткі на розыгрыш дасылалі яшчэ тады, калі ў якасці прызоў былі парачкі парасят, коні... «Што будзем рабіць, калі выйграем?» — пыталася я ў свайго чалавека. Ён адказваў: «Трэба спачатку выйграць, а там паглядзім».

Глядзець ды думаць, дзе ў Мінску паставіць таго жканя ці як гадаваць свіней, сужэнцам не давялося, а вось люстру ў звяздоўскай латарэі яны выйгралі і потым павесілі — свеціць! Новенькі прас таксама дарэчы прыйшоўся. А потым і наогул...

— Неяк раз з Маларытчыны пляменнік пазваніў, Генадзь Мішчук, — узгадвала Таццяна Уладзіміраўна. — Ён у нас паэт, падпісчык «Звязды»... Сказаў: «Дзядзька Ваня, вам у латарэі шанцуе, у вас, мусіць, рука лягчэйшая? Дык можа, вы і нашу картку ў газету пашляце: бензакасілка — да зарэзу патрэбна!» Муж, вядома ж, паслухаў — запоўніў купон, даслаў у рэдакцыю. А потым... Мы паверыць не маглі: яны абодва (!) па трымеры выйгралі! Во дзе дзіва было!

Пра іх, гэтыя дзівосы, і, што называцца, з першых вуснаў, мы ўжо чулі — раней, калі жонка пляменніка ды дачка Гаральчукоў прыязджалі забіраць тыя прызы. А вось згадвалі — зусім нядаўна: пасля таго, як у сценах рэдакцыі разыгралі новыя...

Па добрай старой традыцыі ёсць іх вызначаюць госці — падпісчыкі, паштавікі, супрацоўнікі «Белсаюздрука».

На гэты раз на запрашэнне газеты адгукнуліся **спадарыні Таццяна ГАРАЛЬЧУК і Наталля ЗАЙКО, старшы інструктар упраўлення распаўсюджання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»** *(на здымку)*. Менавіта яны і выцягнулі з чароўнага капелюша (залатыя рукі ў нашай падпісчыцы Аляксандры Лакуткі з Гомельшчыны!) шчаслівыя карткі. Такім чынам, **прасы Bosch выйгралі:**

Уладзімір Васільевіч НЕВЯДОМСКІ, г. Драгічын Брэсцкай вобласці;

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Галіна Канстанцінаўна МАГЛЮЙ, г. Віцебск;

Мікалай Ягоравіч ПАЗНЯКОЎ, г. Нароўля Гомельскай вобласці;

Вера Сцяпанаўна ТАБАЛА, аграгарадок Дубна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці;

Ларыса Міхайлаўна ДЗЕНІСЕВІЧ, в. Коўбча Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці;

Людміла Станіславаўна БАЧЫШЧА, г. Крупкі Мінскай вобласці;

Уладзімір Сяргеевіч ПІШЧУЛІН, г. Мінск.

Суперпрыз — пральную машыну LG — выйграла **Ганна Уладзіміраўна КУПРЭВІЧ з в. Баяры Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.**

Віншуем шчасліўчыкаў!

Тым жа, каго на гэты раз удача абмінула, шчыра жадаем не засмучацца — па-ранейшаму заставацца са «Звяздой» (балазе падпіска ўжо адкрытая), па-ранейшаму дасылаць свае карткі на розыгрыш. І некалі (іначай жа і быць не можа!) вы таксама выйграеце: хай, можа, не парасят, не тэлевізар, не альтанку, не трымер, не пральную машыну... «Звязда» абавязкова нешта прыдумае! З таго, як правіла, што ў хаце абавязкова спатрэбіцца!

Валянціна ДОЎНАР. *dounar@zviazda.by*

АФІЦЫЙНА

Арганізатарам рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Са «Звяздою» — спадручней!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 03.09.2015 г. (пасведчанне № 2619) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 12 верасня па 31 снежня 2015 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» чацвёртага квартала або другога паўгоддзя 2015 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 192 падпісчыкі.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 284 44 04

■ Незвычайнае побач

АБРАЗЫ, ЯКІЯ ЛЕЧАЦЬ

Будзеце ў Краснапольскім раёне — абавязкова наведайце храм у гонар Дзмітрыя Растоўскага ў Выдранцы. Гэты помнік драўлянага дойлідства, пабудаваны без адзінага цвіка, сапраўды незвычайны, тут адчуваеш невымоўную лёгкасць і радасць. У яго намоленых сценах захоўваецца шмат цудадзейных ікон, у тым ліку і тая, што папярэдзіла аб чарнобыльскай катастрофе.



Так святы папярэдзіў пра трагедыю.

Каля іконы Мікалая Цудатворцы здаецца, што ён стаіць побач.

— Незадоўга да аварыі былы настаяцель храма заўважыў у правым куце іконы Серафіма Сароўскага воблака, якое невядома адкуль узнікла. З яго выступала вільгаць, — расказвае настаяцель храма айцец Віктар. — Потым вільгаць знікла, а вось воблака так і засталося. Ніхто тады не зразумеў, што гэта быў знак...

Гэта не адзін цудоўны абраз, які захоўваецца ў выдранскім храме. Ёсць тут ікона Мар'інагорскай Божай Маці, якая міраточыць ужо 5 гадоў. Раіць бацюшка падысці і да абраза Мікалая Цудатворцы — аднаго са старэйшых у храме. Каля яго адчуваецца асаблівая Божая ласка. Такое ўражанне, што святы стаіць побач і чытае твае думкі.

Свята звяртае ўвагу і на скляпенні, дзе па крузе намаляваны херувімы. Блакітная фарба крыху пацямнела ад часу, але між крылаў анёлаў (і сапраўды дзіўна!) дарожкі нябесна-блакітнага колеру. Нават копаць ад свечак іх не кранае.

На тэрыторыі храма знаходзіцца брацкая магіла. Падчас вайны нямецкі снайпер, які схаваўся ўнутры царквы, забіў 40 чырвонаармейцаў. Ворага знялі толькі пасля таго, як запалілі непадалёку хлеў і ў дыме ён страціў арыенцір. А савецкіх салдатаў пахавалі побач з храмам. Пра вайну тут нагадвае і звон, зроблены з абалонкі авіябомбы.

Айцец Віктар — ураджэнец гэтых мясцін, таму і лічыць сваім абавязкам вярнуць да жыцця тутэйшыя святыні. З яго ініцыятывы ачышчаны крыніцы ў Выдранцы і суседняй вёсцы Мхінічы. З існаваннем апошняй звязана цікавая гісторыя. Калісьці ў Мхінічах жылі набожныя муж з жонкай. Аднойчы яны прачнуліся раніцай і ўбачылі, што пасярод іх двара б'е крыніца. Узрадаваліся сужэнцы і, каб кожны чалавек змог прыйсці да крыніцы, перанеслі свой двор крыху далей. З тых часоў да святога месца ідуць паломнікі. Айцец Віктар гаворыць, што людзі не раз казалі яму пра цудоўныя вылячэнні. У кагосьці страўнік перастаў балець, у кагосьці галава. І ўсё дзякуючы цудадзейнай крынічцы. Не менш паломнікаў і да крыніцы ў Выдранцы. Людзі вераць, і Бог іх ратуе.

Абразы на дрэвах (Мхінічы).

Дарэчы, храму ў гонар Дзмітрыя Растоўскага нядаўна споўнілася 110 гадоў. Ён быў пабудаваны з ініцыятывы мясцовай памешчыцы Марыі Бараноўскай. Паводле легенды, жанчына пакутавала на невылечную хваробу і дала абяцанне перад Богам, што пабудуе на гэтым месцы храм. І слова стрымала. «Яна сапраўды вылечылася, — сведчыць айцец Віктар. — І было ёй адкрыццё, што будуць храмы рушыць, а гэты не крануць. Так яно і адбылося».

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by
Фота аўтара

■ Добрая навіна

НАШЫ ЗНОЎ ЧЭМПІЁНЫ СВЕТУ!

Беларускія міліцыянеры атрымалі перамогу на неафіцыйным чэмпіянаце свету па міні-футболе сярод паліцэйскіх і ратавальнікаў, які сёлета прымаў галандскі Грунла. Што цікава, нашы становяцца чэмпіёнамі ўжо другі год запар. У фінале ў цяжкай барацьбе нашы суайчыннікі перамаглі калег з Расіі з лікам 2:1. Але, як лічыць Віктар Янчуковіч, начальнік аддзела ўпраўлення прафпадрыхтоўкі МУС, асабліва складаным для беларускай каманды атрымаўся матч з Сербіяй. Балканцы адкрылі лік на першых хвілінах сустрэчы. Зраўняць яго ў беларусаў атрымалася на апошніх секундах сустрэчы. На шчасце, фартуна ў серыі пенальці была на нашым баку. Варта дадаць, за турнір беларускія праваахоўнікі правялі 12 матчаў і ў наводным не саступілі. Другое месца заняла дружына Федэральнай службы Расійскай Федэрацыі па кантролі за абарачэннем наркотыкаў, на трэцім — ратавальнікі з Санкт-Пецярбурга. Віншуем!

Якаў ЖУРБІН

■ Соцыум і тэхналогіі

НАВУЧЫЦЬ БАБУЛЮ СЭЛФІЦЬ

Чытаць кнігі на электронных носьбітах, серфіць у інтэрнэце, рабіць і праглядаць фота ці відэа, мець зносіны праз месенджар і сацыяльныя сеткі — ці шмат што з гэтага ўмеюць рабіць нашы бабулі з дзядулямі? А слова «гаджэт» многія з іх дагэтуль падазраюць у прыналежнасці да лаянкавых... Каб выправіць гэтую сітуацыю і вывесці пенсіянераў з «ценю» вымушанай сацыяльнай ізаляцыі, кампанія «МТС» распрацавала новую адукацыйную праграму для пенсіянераў «Планшэт з нуля».



Вольга Сямёнаўна ІВАНОВА (78 гадоў) вучыцца дыстанцыйна на менеджара. Заяўляе, што курсы ёй вельмі патрэбны, і яна не прапусціць ніводнага занятку.

Для найбуйнейшага мабільнага аператара краіны гэта ўжо другі сацыяльна-асветніцкі праект пасля праграмы «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя». Ён таксама скіраваны на ліквідацыю «лічбавай» няроўнасці розных пакаленняў і мае на мэце бясплатна навучыць людзей пажылога ўзросту карыстацца ўсімі функцыяналамі і магчымасцямі «разумных» мабільных прылад, уключаючы мабільны інтэрнэт, сацыяльныя платформы для зносін, дзяржаўныя электронныя сэрвісы і многае іншае. Вучэбная праграма збудавана з улікам псіхалагічных асаблівасцяў пажылых людзей і складаецца з 10 заняткаў, якія будуць праходзіць раз на тыдзень. Першыя класы праекта «Планшэт з нуля», у які запісаліся ўжо больш як 150 чалавек, адкрыюцца напрыканцы кастрычніка ў Мінску і Гомелі.

Каардынатар сацыяльных праектаў Аліна ШАПАВАЛАВА расказвае пра новыя курсы.

Праблема лічбавага разрыву становіцца для беларускага грамадства ўсё больш вострай. Ужо сёння пенсіянеры складаюць больш за 27% насельніцтва Беларусі, а да 2050 года, паводле прагнозаў Сусветнага банка, гэты паказчык вырасце да 36%. Аднак умоў для рэалізацыі асобаснага патэнцыялу пажылых людзей і іх удзелу ў жыцці грамадства ўсё яшчэ недастаткова — у тым ліку з-за іх невысокага ўзроўню валодання сучаснымі тэхналогіямі.

Перад запускам адукацыйнага праекта «Планшэт з нуля», які ініцыявалі, дарэчы, самі пенсіянеры, кампанія «МТС» правяла сярод будучых навучэнцаў даследаванне. Высветлілася, што 54% з іх цікавяцца перадусім мабільным інтэрнэтам, 15% збіраюцца гуляць у гульні, 12% маюць намер актыўна падтрымліваць зносіны з сябрамі і сваякамі ў месенджары і сацыяльных сетках, 11% хочуць рабіць пакупкі анлайн, а 8% — глядзець відэа і чытаць кнігі. Усё гэта змогуць рабіць выпускнікі курсаў — таксама як і самастойна ўсталёўваць патрэбныя праграмы, апрацоўваць і загружаць у інтэрнэт фотаздымкі, плаціць анлайн за камунальныя паслугі, браніраваць квіткі на транспарт ці на канцэрты, замаўляць талончыкі да ўрача, шукаць патрэбныя лекі ў аптэках.

«Цікавасць да мабільных прылад і інтэрнэту хутка ўзмацняецца, і пажылыя людзі тут не выключэнне. Сёлета мы атрымалі ад пенсіянераў на траціну больш заявак на навучанне карыстаннем планшэта, чым у 2014-м. Гэтая лічба наглядна дэманструе, што неабходнасць у навучанні пажылых людзей мабільным гаджэтам ужо наспела і працягвае павялічвацца», — адзначыла каардынатар сацыяльных праектаў МТС Аліна Шапавалава.

Навучацца студэнты будуць на планшэтах кампаніі Huawei, якая выступае партнёрам праекта. Асвоіць сучасныя тэхналогіі пенсіянерам дапамогуць уважлівыя і спагадлівыя выкладчыкі-валанцёры. Як расказаў спецыяліст па рабоце з кліентамі кампаніі Huawei Сяргей Чарнаштан, пры падрыхтоўцы курсаў вялікая ўвага надавалася не толькі распрацоўцы вучэбнага дапаможніка, але таксама і выбару мадэлі планшэта для заняткаў. «Спыніліся на планшэце Huawei MediaPad T1 8.0: ён недарагі, мае высокую прадукцыйнасць, падтрымлівае званкі і sms. Акрамя таго, мы ўпэўнены, што выпускнікі праекта, якія навучацца карыстацца сэнсарным экранам планшэта, з лёгкасцю змогуць самастойна асвоіць і смартфон».

Кіраўнік прэс-службы кампаніі МТС Таццяна Курбат адзначыла, што мясцовыя ўлады і цэнтры сацыяльнай аховы актыўна садзейнічалі рэалізацыі праекта. Што тычыцца валанцёраў, то гэта людзі, якія вельмі захапіліся ідэяй і жывуць ёй — адносіны са «студэнтамі» (яшчэ па «Сеціве») у іх складваюцца практычна сяброўскія. Між іншым, сярод іх і тыя, хто прайшоў мінулыя курсы і сам стаў навучаць іншых, і нават дзеці-падлеткі. Напрыклад, Яраслава Пасталенка прыйшла працаваць валанцёрам, калі ёй было ўсяго 10, і ўжо два гады адданая гэтай вельмі карыснай і цікавай справе.

Іван ХВІР. *hvir@zviazda.by*

ЛІЧБЫ

55—62 гады — сярэдні ўзрост «студэнтаў».

У 20% карыстальнікаў байнэту, старэйшых за 55 гадоў, ёсць смартфон або планшэт.

На 34% павялічылася колькасць мужчын, якія запісаліся на курсы.

Больш за 60% пенсіянераў ніколі не карысталіся мабільнымі гаджэтамі і інтэрнэтам.

82 гады самаму старэйшаму ўдзельніку праграмы «Планшэт з нуля».

■ Набалелае

ХТО ПРЫВЯДЗЕ Ў ПАРАДАК ВАДАЁМ?

Каб жыць у камфортным асяроддзі, трэба яго ствараць

Адно з маіх любімых месцаў у Мінску — мікрараён Зялёны Луг, дзе я нарадзілася і жыла большую частку свайго жыцця. Вядома, родныя мясціны грэюць душу. Але нават прыезджым немагчыма не ўпадабаць гэты адзін з самых экалагічных і спакойных куточкаў сталіцы. Праўда, апошнім часам назіраю, як мікрараён з інтэлігентнага стаў пераўтварацца ў звычайны «спальнік» са звыклым ужо пейзажам: купкамі «паношанага» выгляду не старых яшчэ мужчын у «позах гарністаў» з бутэлькамі таннага пладова-ягаднага віна пад маляўнічымі дрэвамі ў скверах і ўздоўж воднага канала...

Ён, канал, — частка Сляпянскай воднай сістэмы, якая, у сваю чаргу, уваходзіць у склад Вілейска-Мінскай воднай сістэмы. Рака Слепня (Сляпянка) і паселішчы, вытворныя ад гэтага тапоніма, згадваюцца ў дакументах з XVI стагоддзя. Тэрыторыя па берагах ракі з пачатку XIX ст. належала вядомаму беларускаму шляхецкаму роду Ваньковічаў. У пачатку 1930-х гадоў у пойме Слепні знаходзілася доследная бульбяная станцыя. Будаўніцтва Сляпянскай воднай сістэмы на базе ракі Гізы пачалося ў 1981 годзе, хоць задумвалася яно яшчэ ў 1970-х, а ў 1985-м было завершана.

Па задумцы архітэктараў так званы водна-зялёны дыяметр горада, утвораны ракой Свіслач і навакольнымі вадасховішчамі, павінна было дапоўніць водна-паркавае кольца, сістэма штучных і натуральных вадаёмаў агульнай працягласцю каля 40 км, створаных на базе ручаёў Сляпянка і Лошыца. Будаўніцтва толькі першай чаргі гэтага гідратэхнічнага комплексу расцягнулася надоўга, але атрыманы вынік можна назваць адным з самых буйных, калі не найбуйнейшым дасягненнем усёй савецкай ландшафтнай архітэктуры. Шэраг маляўнічых каналаў з вадаспадамі праходзіць практычна праз увесь мікрараён. Праект у свой час атрымаў Ленінскую прэмію — найвышэйшую ўзнагароду ў Савецкім Саюзе.

Асноўным збудаваннем Сляпянскай сістэмы з'яўляецца Цнянскае вадасховішча. Наступная яе дамінанта, пра якую і вялася гаворка вышэй, размясцілася ў раёне скрыжавання Лагойскага тракта з вуліцай Карбышава, тут пабудавалі адзін з найпрыгажэйшых каскадаў усёй сістэмы. Бетоннае збудаванне з умураванымі ў яго валунамі падобна да натуральнай скалы, яно сапраўды ўражвае. Вышыня зліву ў гэтым шматступеньчатым каскадзе складае 4,3 м. У комплексе зроблены і дэкаратыўны вадаём плошчай у 1,5 га. Уздоўж вуліцы Сядых водна-зялёная зона вырашана ў выглядзе бульвара раённага значэння з сістэмай каналаў, выспаў, зліўных фантанаў і басейнаў.

Летам канал ператвараецца ў пляжную зону, тым больш што ўзгорысты рэльеф гэтай мясцовасці спрыяе выдатнаму загару. Гэта любімае месца для прагулак мам з каляскамі, аматараў сабак, падлеткавых кампаній, закаханых парачак. Наведваюць сюды і рыбакі. Раней тут вадзілася прасноводная рыба, аднак цяпер замест яе ўсё часцей можна «вылавіць» пустыя бутэлькі з-пад піва і больш моцных напояў ды іншае смецце. На жаль, сістэма з-за адпаведнай якасці будаўніцтва і будматэрыялаў дэградуе. Архітэктары разумелі непазбежнасць гэтага ўжо адразу пасля завяршэння работ і змагаліся за стварэнне спецыяльнай «службы эксплуатацыі водных аб'ектаў», асноўнай дзейнасцю якой быў бы догляд унікальных збудаванняў. Аднак гэтая служба так і не была створана.

Ужо шмат гадоў канал сур'ёзна не чысцілі, і адпачываць тут стала некамфортна праз непрыемны пах ціны. Апроч натуральнага зарастання водарасцямі, заняпаду ўнікальнага канала спрыяе і антрапагеннае забруджванне.

Аднак ёсць спадзяванне, што неўзабаве канал усё ж прывядуць у парадак. Нядаўна **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** даручыў да канца года паўсюдна выканаць і завяршыць работы па добраўпарадкаванні зялёных зон уздоўж вадаёмаў Мінска. А налета берагі цалкам вызваляць ад зараснікаў, сухастойных дрэў і смецця, і за справу возьмуцца работнікі «Мінскводаканала», якія прачысцяць акваторыю гэтых вадаёмаў.

— Варта падумаць і пра ўсталяванне там лавак, іншых малых архітэктурных формаў. Калі парадак будзе наведзены, гэтыя тэрыторыі трэба замацаваць за суседнімі арганізацыямі і прадпрыемствамі, каб тыя ў далейшым падтрымлівалі зялёныя зоны ў належным стане, — заявіў Уладзімір Кухараў.

Дарэчы, любы ахвотны можа сам паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні зялёных зон ля вадаёмаў. З 3 кастрычніка ва ўсіх раёнах горада пачаліся штотыднёвыя суботнікі, на якіх плануецца задзейнічаць каля тысячы чалавек.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 35 (292)

■ Дата

«КУЛЬТУРНЫ» СПЛАЎ МАЛАДОСЦІ І ТАЛЕНТУ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў адзначае 40-годдзе з дня заснавання.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

У адной з галоўных творчых ВНУ краіны адбываюцца ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды круглай даты. Адно з іх шэрагу прайшло днямі на малой сцэне Палаца Рэспублікі, дзе сустрэліся людзі, лёс якіх так ці інакш звязаны з універсітэтам.

— Насамрэч, першы корпус тады яшчэ Інстытута культуры адкрыўся раней, 6 кастрычніка 1975 года, — распавядае **першы прарэктар БДУКМ Аліна КОРБУТ.** — І сённяшнее мерапрыемства — толькі адно з ліку тых, што мы запланавалі. Некалькі дзён таму адбылося пасяджэнне вучонага савета. Неўзабаве пройдзе навуковая канферэнцыя, прымеркаваная да гэтай падзеі. Сёння ж адбудзецца ўрачыстае ўшаноўванне і ўзнагароджанне нашых вядучых супрацоўнікаў, людзей, якія шмат зрабілі для развіцця адукацыі і культуры ў Беларусі. У госці да нас прыйдуць выкладчыкі ўніверсітэта, як цяперашнія, так і ветэраны; студэнты; прадстаўнікі ўстаноў, з якімі мы цесна супрацоўнічаем. А ў падарунак усе атрымаюць канцэрт, падчас якога выступяць нашы студэнцкія калектывы.

— Гісторыя нашай вельмі маладой па сусветных мерках установы — гэта гісторыя паступовага развіцця, стварэння новага, — падзяліўся думкамі **рэктар універсітэта культуры і мастацтваў Юрый БОНДАР.** — Мы з аптымізмам глядзім і ў наступныя 40 гадоў. Універсітэт імкнецца адэкватна рэагаваць на патрэбы грамадства, на спецыфіку постіндустрыяльнай эпохі. Але галоўнае — у нашай краіне, як і раней, вельмі шмат таленавітай моладзі, якой мы дапамагаем знаходзіць сябе і развівацца. Конкурс у БДУКМ застаецца стабільна высокім, на некаторыя спецыяльнасці — да пяці чалавек на месца; студэнты прыходзяць матываванымі да вучобы, а ў краіне цяжка знайсці ўстанову, дзе не працавалі б нашы выпускнікі. Ды і творчыя дасягненні ўніверсітэта цяжка не заўважыць. Напрыклад, летась адбылася прэм'ера мюзікла «Дуброўскі», створанага намаганнямі нашых студэнтаў. Цяпер прыступаем да рэалізацыі яшчэ аднаго маштабнага праекта, таксама мюзікла. Спадзяюся, гэтыя тэндэнцыі захаваюцца і надалей.

Афіцыйная цырымонія ўзнагароджання распачалася з агучвання віншавання кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, якое прысутным зачытаў міністр культуры Барыс Святлоў (дарэчы, у мінулым — рэктар БДУКМ). Падзякі ад Міністэрства культуры супрацоўнікам універсітэта ўручаў намеснік міністра Аляксандр Яцко, ад Міністэрства адукацыі — першы намеснік міністра Вадзім Богуш. Павіншавалі ВНУ і сталічныя дэпутаты ў асобе старшыні Мінгарсавета Васіля Панасюка. Не магла не крануць прысутных прамова акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандра Кавалені, які ўзгадаў, як стваралася навучальная ўстанова. А выпускнік інстытута культуры 1983 года, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, перадаў у бібліятэку БДУКМ першыя тамы факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны».

Завяршаў свята канцэрт, які падрыхтавалі студэнты розных спецыяльнасцяў універсітэта. Спевы і танцы — у такой кампаніі бавілі вечар госці. Сімвалічна, што вядучымі канцэрта былі выпускнікі ўніверсітэта культуры і мастацтваў — тэлевядучая Вольга Рыжыкава і спявак Тэа (Юрый Вашчук).

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■ Вернісажы

ПАРЫЖСКАЕ ПАВЕТРА ВОСЕНЬСКАГА МІНСКА

Вішанькі, яблыкі і іншыя смакі для цывілізаванага арт-рынку

Дзякуючы славутым парыжскім мастацкім салонам пачатку XX ст. свет адкрыў безліч творцаў, імёны якіх вядомыя ва ўсім свеце, а творы прадаюцца па ашаламляльных коштах. Цяпер ёсць магчымасць зрабіць падобныя адкрыцці ў Беларусі: у сталічным Палацы мастацтваў праходзіць першы (!) у краіне «Асенні салон з Белгазпрамбанкам», дзе кожны малады мастак мае шанц быць адкрытым, а кожны глядач — магчымасць набыць твор мастацтва.

Таму што гэта выстава, дзе ля карцін разам з подпісамі пазначаны кошт. Але прадаецца не ўсё: ёсць творы тых самых знакавых для Беларусі мастакоў Парыжскай школы. Яны знаходзяцца ў карпаратыўнай калекцыі «Безгазпрамбанка»: творы Шагала, Суціна, Кікоіна, Бакста і іншых мастакоў. Як не пайсці паглядзець, напрыклад, на «Лунаціка» Марка Шагала ці «Ноч на святога Іаана» Дзмітрыя Сцялецкага, «Гарадскі пейзаж» Восіпа Любіча, якія дэманструюцца ўпершыню? Ужо гэта — сенсацыя. Яшчэ адна: разам, у гэтай жа прасторы, выстаўляюцца сучасныя беларускія мастакі. Наша сёння і наша заўтра: ім да 40 гадоў. І хто ведае, ці няма сярод іх талентаў, якія, можа быць, не адчуваюць да сябе належнай увагі з боку айчыннай публікі, але вартыя яе? Дзеля таго, каб трапіць на выставу, яны праходзілі праз конкурсны адбор. Напачатку было прадстаўлена 800 прац ад 300 творцаў. І ўсё гэта прадаецца — і жывапісныя палотны, і графічныя работы, нават скульптуры! Цэны кожны аўтар выстаўляў сам. Але падчас выставы будзе ісці і галасаванне за найбольш цікавыя творы. Таму, нават калі нехта не можа ўласна грашыма падтрымаць мастака, то ён здольны паўплываць на вынік яго ўдзелу ў выставе: прызавы фонд складае 25 тысяч еўра.

Грашовы кірунак мае сэнс яшчэ і таму, што падчас гэтай выставы арганізатары імкнуцца прыцягнуць увагу да такой загадкавай з'явы, як «арт-рынак» Беларусі. Тое, без чаго немагчымы сучасны мастацкі працэс: таму што мастакі ў цывілізаваным грамадстве не павінны быць галоднымі, яны могуць зарабляць на сваіх творах. Адпаведна, патрэбны людзі, якія б маглі за гэта заплаціць і разумелі, з чаго складаецца гэты кошт. Таму ў рамках «Асенняга салона з Белгазпрамбанкам» на «круглым стале» абмяркоўвалася тэма існавання калекцыянераў у Беларусі. Некаторыя з іх нават былі гатовыя адкрыта (што бывае даволі рэдка) гаварыць пра асаблівасці сваіх калекцый.

Старшыня праўлення «Белгазпрамбанка» Віктар БАБАРЫКА:

— Калекцыянер — гэта звычайна фізічная асоба. У нашым выпадку, наадварот, калекцыю стварае юрыдычная асоба. Пачалося з нашай працы ў сацыяльным кірунку, дзе адным з праектаў стаў «Арт-Беларусь». Мы прыйшлі да пытання: што ж можна ў Беларусі збіраць, чым краіна можа ганарыцца? Дапамагла вызначыцца кніга Уладзіміра Шчаснага «Мастакі парыжскай школы з Беларусі». Гэта пласт мастацтва, які ведае ўвесь свет. Але паўстала тэма вяртання культурнай спадчыны. Пайшла тэхнічная праца па выяўленні тых знакамітых творцаў, якія з'яўляюцца выхадцамі з Беларусі, твораў якіх няма ў нашай краіне. Фактычна ўся наша калекцыя з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Яе сэнс у тым, што мы запаўняем лакуны. Уявіце сабе, што ў Беларусі да гэтага часу не было б Шагала, Суціна, Кікоіна? Тут што ні вяртай — усё радасна вітаюць. У гэтым і вялікі мінус: калекцыя эклектычная.

Але мы парушылі ўяўленне пра калекцыянераў: усё, што мы збіраем, «Белгазпрамбанку» не трэба, мы гэтага не хаваем. Наша калекцыя — гэта, груба кажучы, — вішанька на торце. Але павінна быць аснова, торт, каб яго ўпрыгожыць гэтымі вішанькамі. Каб працы Баброўскага, якога ўсе ведаюць, але твораў не бачылі, ці Рушчыца, яго беларускія пейзажы, заіграл б. Усе гэтыя творы глядзяцца ў рамках вялікіх выстаў, як праект «10 стагоддзяў мастацтва Беларусі». Мы набылі сёлета 4 цудоўныя творы Бакста, якіх не было ў Беларусі. Але каб прадставіць іх, патрэбна супрацоўніцтва з іншымі калекцыянерамі, дзеля паўнавартаснай выставы. Таму я прапаноўваў бы нас разглядаць не як калекцыянера, а як партнёра: давайце разам зробім справу, якая б упрыгожыла культурнае жыццё нашай краіны, каб людзі потым казалі: «Ваў!» Наша мэта ў прасоўванні беларускага мастацтва ў жаданні — рабіць «ваў-эфект». Мы маем магчымасць набываць рэчы для гэтага. Але для гэтага патрэбна аснова і супольная праца.

Калекцыянер і мастак Андрэй ПЛЯСАНАЎ, які падчас вучобы на рэжысёрскім факультэце Тэатральна-мастацкага інстытута пазнаёміўся з Цэслерам, Малішэўскім, Хацкевічам, Сурыновічам, Сазыкінай, Глобусам і яшчэ сотняй супермастакоў (так ён лічыць), расказвае:

— Адбіраю творы з пункту гледжання таго, што мне падабаецца, недорага набываю. Нехта адмаўляецца, таму што ён дарагі мастак. Няхай. Я сваю калекцыю не прадаю. На мой погляд, мастак — гэта яблыня. У нас цэлы сад яблынь. Адна дае салодкія яблыкі, другая кіслыя, трэцяя гаркаватыя. Адны можна з'есці, другія захаваць, з трэціх можна зрабіць віно. Напрыклад, у нас ёсць Рыгор Несцераў — супермастак. Не народны, але чалавек, які ўвайшоў у 1000 найлепшых мастакоў канца XX стагоддзя, у сусветную калекцыю. Чаму яго не купляць? Я, мастак-дылетант, таксама туды ўвайшоў. З Беларусі ўсяго 11 чалавек. Чаму іх не збіраць? І добра, што знаходзяцца людзі і арганізацыі, якія гэта збіраюць і маюць магчымасць прадставіць. Людзі папаўняюць культурную прастору Беларусі. Я, на жаль, такой магчымасці не маю (у мяне няма спонсараў і няма столькі грошай). Але выставы час ад часу бываюць з удзелам твораў з маёй калекцыі, у прыватнасці ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.

Калекцыянер, куратар праекта «АртДайджэст-Беларусь» Таццяна МАРКІНА:

— Я пакуль далёкая ад таго, каб мая калекцыя стала часткай беларускай спадчыны. Але я са сваёй калекцыяй удзельнічала ў культурным жыцці Мінска. Гаспадыня галерэі «Кніжны салон» Аля Зміёва запрасіла мяне аднойчы на тэматычную выставу, прысвечаную Ван Гогу. Я ўзгадала, што ў маладога беларускага мастака Алега Касцючэнкі ёсць карціна, «Люлька Ван Гога». Паехала да яго ў майстэрню, каб папрасіць напракат. Ён сказаў: «Хочаш — купляй». Прыйшлося купіць. Але запрасіла яго ў салон, дзе праца была прадстаўлена. Тады мне прыйшла думка: чаму б не зрабіць іншы праект на тэму інтэрпрэтацый вялікіх мастакоў? Зрабіла выставу з 12 беларускімі мастакамі ў галерэі Шчамялёва, яна мела працяг у Гомелі ў галерэі Вашчанкі.

В. БАБАРЫКА: — Любы калекцыянер мае на ўвазе, каб яго калекцыя расла ў кошце, каб яе прадаваць. Ёсць такая катэгорыя, як час: ён заўсёды працуе на калекцыянера. Мы купляем і экспануем тое, чаго не было. Але ж і сучасным мастацтвам займаецца безліч людзей. Чаму гэта не прасоўваецца? Акрамя часу, ёсць яшчэ адзін фактар, які ўплывае на кошт: прасоўванне і прызнанне калекцыі ці твораў знешнім бокам. У гэтым кантэксце мне дзіўнае беларускае калекцыянаванне: чаму не працаваць на вядомасць сваёй калекцыі і наданне ёй дадатковай каштоўнасці?

У рамках арт-праекта «Асенні салон» мы спадзяёмся на стымуляцыю інвестыцыйнай прывабнасці беларускіх сучасных мастакоў. Мы робім гэты крок і імкнёмся высветліць: хто на рынку Беларусі цікавы? Як спытаць — дык талентаў у нас шмат. Але цяпер мы спрабуем знайсці мастакоў, таленавітых з пункту гледжання незалежнага меркавання. Мы нездарма сюды прыцягнулі каштоўныя рэчы з нашай калекцыі: тую самую вішаньку, на якую прыйдуць. Але большая частка — моладзь, гэта 40 мастакоў. І кажуць, што 13 твораў ужо прададзена. Значыць, цікава, хоць прынцыпы адбору можна і ўдасканаліць. Усе мы розныя, але можам аб'яднаць высілкі. Толькі трэба пераадолець лакальнасць — гэта наша бяда. Я за тое, каб не лакалізаваць свае калекцыі. Цяпер у нас ёсць тры кампаненты: прыватны калекцыянер, які наталяецца працамі, таму што ўсё жыццё іх збіраў, арт-дылер, які павінен займацца прасоўваннем мастакоў, і тыя людзі, якім трэба патраціць грошы, але яны не ведаюць, як гэта лепш зрабіць.

Скульптар Канстанцін СЕЛІХАНАЎ:

— Я думаю, што ў сілу гістарычных ці іншых прычын нашы калекцыянеры, нават калі яны ёсць, робяць усё для таго, каб ніхто пра іх ніколі не даведаўся. Але калекцыянеры маюць свой погляд на рэчы ў залежнасці ад шмат якіх абставін. Бываюць нечакана цікавыя ініцыятывы, як, напрыклад, набываць і паказваць найлепшыя работы народных мастакоў Беларусі, што зрабілі ў галерэі «Дом карцін». Аказваецца, нашы народныя мастакі даволі добра пісалі ў 50-я, 60-я гады. Што перашкаджала нашым тайным «ценевікам» купіць і выставіць гэта? Таксама прычына ў менталітэце, закладзеным пры Савецкім Саюзе. Чаму Сяроў ці Шышкін тады не каштавалі столькі, як цяпер? Адсутнасць рынку ў Савецкім Саюзе не давала магчымасцяў пра гэтых мастакоў даведацца ў свеце. Таму мы ведаем толькі тых, хто з'ехаў. Астатнія забытыя. У нас жа зусім не факт, што пасля смерці мастак будзе славутым. А што адбываецца са спадчынай мастакоў, якія паміраюць? У лепшым выпадку яна не знішчаецца...

Мастацтвазнаўца, дырэктар галерэі «Дом карцін» Ларыса БОРТНІК:

— Калекцыі бываюць вельмі рознымі. Бессістэмныя — для таго, каб парадавацца. Тэматычныя. Ці калі збіральнік выстаўляе на публіку як агульную спадчыну. Але можна пайсці і далей, на больш шырокую прастору, за мяжу. У нас усе топчуцца на першым узроўні. У рэдкіх выпадках пачынаюць паказваць. І тады адкрываюцца дзіўныя рэчы. Сёння, калі мы выпусцілі калекцыю народных мастакоў, я разумела, што ў той дзяржаве быў нехта, хто даваў званні за творчае аблічча. З 19 мастакоў, якіх мы паказалі (а ў нас іх 31), няма падобных адзін да аднаго. Але калі мастак сышоў, на яго творчасць можна паглядзець з вышыні, лягчэй вызначыць, варта яго набываць ці не. Сучасным творцам меней увагі. Нехта ставіць на сучасных, але гэта рызыка, калі гаворка пра сур'ёзныя грошы. У нас шмат прадпрыемстваў збіралі калекцыі, а потым не ведалі, што з гэтым рабіць. Гэтая выстава праграмная: акрамя таго, што ёсць перліны, якія рассыпаліся па свеце, яшчэ ідзе падтрымка маладых.

В. БАБАРЫКА: — Самае важнае — зрабіць крок ад лакальнага рынку да знешняга. Мне здаецца часам, што моладзь не верыць у перспектыву. Страшна не тое, што яны без веры гатовыя з'язджаць: страшна тое, што, не з'язджаючы, пагаджаюцца, што нічога немагчыма зрабіць. Таму вельмі хочацца абудзіць рынак продажаў, каб мастакі паверылі, што яны цікавыя. Трэцяя: з дапамогай міжнароднага журы вызначыць мастакоў, якіх можна было б прасоўваць далей.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ «ТэАрт»

МАГЧЫМА

Вобраз сучаснай Беларусі ў тэатры

Што за... Тэатр без сюжэта і нейкай выразнай гісторыі? У ім можа не быць нейкага героя, вакол якога закручваецца інтрыга, ды і інтрыга не абавязковая, але пры гэтым некалькі фіналаў (ці варта лічыць?), ды і тэкст можа быць ці не быць галоўным кампанентам, таму што асобным выказваннем з'яўляецца форма. Постдраматычны тэатр — так гэта назваў нямецкі даследчык Ханс-Ціс Леман напрыканцы XX стагоддзя, калі гэтая з'ява ў заходняй тэатральнай практыцы стала звычайнай, яе замацавалі нават асобным тэрмінам. Не проста плынь, а новая тэатральная рэчаіснасць. Тэатр жа — люстэрка жыцця, выяўляе яго імклівасць, уплыў тэхнікі, асаблівы эмацыйны фон. Аднак былі дзесяцігоддзі, калі такі тэатр лічыўся эксперыментам. У нас дык лічыцца дагэтуль, у другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя.

Сцэна са спектакля «Мабыць?» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Тое, з чаго сёлета складзена праграма Belarus Open у рамках міжнароднага тэатральнага форуму «ТэАрт», — наша наватарскае. Кожную пастаноўку можна разглядаць у кантэксце таго, што прывозілі на фестываль госці — так і імкнуліся паказаць тэатральную Беларусь арганізатары форуму. Яны маюць рацыю.

Асобныя спробы ці пастаноўкі ствараліся ў Беларусі ў падобнай стылістыцы ўжо на мяжы стагоддзяў, праўда, адзінкавыя. У асноўным тымі рэжысёрамі, якія былі ў кантэксце развіцця сусветнага тэатра, ездзілі на фестывалі ў Еўропу, а потым стваралі спектаклі, «фестывальныя» (як сказалі б аматары кіно). Праўда, часта насуперак чаканням айчынных гледачоў, якія ў большасці сваёй працягваюць жыць у кантэксце тэатра драматычнага, дзе ўсё зразумела, па паліцах, пажадана з прыгожымі касцюмамі, без залішніх разумнасцяў ці абстракцый — з імі ж не разняволішся, увесь час сядзі і нешта думай, выводзь... Сам.

Што за?.. Тэкст кавалкамі, асобнымі маналогамі, фразамі. Нібыта падслуханымі ў жыцці — на вуліцы, па тэлевізары ці яшчэ дзе. Вонкавы вобраз — нейкая ілюзія. Нават класіку не пазнаць — за што ж так з нашым гледачом, шчырым і ўдзячным па сутнасці? Ён жа можа не вытрыма-а-аць. Не, даказана: наш перажыве, застануцца самыя цікаўныя, хто ў пошуку. Чулыя і адкрытыя да новых формаў тэатра, адпаведна, да новых формаў жыцця. Таму што ў сучасным тэатры (дзе ўжо праяўляе сябе постпост эстэтыка) прастора настолькі гнуткая, што лішнія дэкарацыі могуць толькі замінаць эмацыянальнаму эфекту, які дасягаецца не толькі словамі, але рухамі, святлом, музыкай (усё часцей жывой), ці нават відэарадам і іншымі тэхнічнымі «наваротамі». Форма — гэта своеасаблівы тэст на адносіны да рэчаіснасці, з аднаго боку. А з другога, і гэта не аксіёма, калі гаворка пра Беларусь. Але дакладна: тыя, каго ў нас прыцягвае форма, яшчэ больш схільныя шукаць у ёй сэнс.

Калі паглядзець спектаклі запрошаныя — то відавочна, што такі глядач у нас ёсць, ён хоча іншага. У яго ёсць шанц — наперадзе тыдзень, калі яшчэ можна паглядзець спектаклі «ТэАрта». І будзе стараццца. Таму што сярод беларускай тэатральнай рэчаіснасці пануе ў асноўным рэпертуарны тэатр, больш традыцыйны — і гэта таксама наша адлюстраванне жыцця праз сцэну. Традыцыйны драматычны, у якім акцёры разыгрываюць уцямную гісторыю, — наша ўсё. Ён такі жывучы і запатрабаваны, таму што адпавядае сутнасці беларускага жыцця з яго кансерватызмам, калі большасць пагаджаецца з пратактнымі і праверанымі падыходамі да ўсяго.

Але не значыць, што няма ці не прапануецца альтэрнатывы, у якой рэжысёр мае права быць розным (рамкі рамкамі, але ж мастацтва заўсёды імкнулася выйсці за іх). Такі, як Аляксей Ляляўскі ці Яўген Карняг, Вячаслаў Іваземцаў ці Таццяна Траяновіч, запрошаныя Саўлюс Варнас (які ў Беларусі гне сваю лінію) і Іскандэр Сакаеў (не прагінаецца пад шырокія густы), Аляксандр Марчанка ці Вольга Лабоўкіна і іншыя. Ужо не адзінкі. Рэжысёры ствараюць тэатр у залежнасці ад жыццёвага пункта, у якім знаходзіцца грамадства, якое яны прадстаўляюць. А яно ўсё ж у руху (хуткасць — іншае пытанне). З гэтага пункту гледжання і трэба ставіцца да тых прац, якія былі адабраныя ў беларускую праграму, пра якую гаворка будзе ісці ў наступным выпуску. Таму што бываюць нагоды дзівіцца тым сілам, якія праяўляюцца ў беларускім тэатры і даюць гледачу права выбару, што ўжо значна. Глядач можа не разумець, навошта яму гэта вось такое, але ў яго з'яўляецца шанц аднойчы трапіць на нейкі такі спектакль, калі захочацца сказаць: «Што за!..» І ўбачыць сваю краіну ў тэатры іншымі вачыма.

Ларыса ЦІМОШЫК
tsimoshyk@zviazda.by

■ Кінакрокі

ЗБЯРЫ МЯНЕ З САБОЮ

Вобраз нашага кіно вызначаецца ўвосень

У найбліжэйшы час у нас ёсць дзве выдатныя магчымасці ацаніць дасягненні беларускіх кінатворцаў. Акрамя нацыянальнага конкурсу мінскага кінафестывалю «Лістапад», гэта Варшаўскі кінафестываль Bulbamovie, паказы якога ў межах з 23 да 25 кастрычніка пройдуць у Варшаве, Кракаве і ўпершыню ў Мінску. «Бульбамуві», у параўнанні са сваім калегам, мае багацейшую гісторыю — вобраз беларускага кіно сёлета прадставіцца пяты раз. Тут паказваецца поўны і кароткі метр, ігравое і неігравое, незалежнае і «беларусьфільмаўскае» кіно. Сёлета конкурсная праграма адбіралася з 47 заявак і склалася ў выніку з адзінаццаці кароткаметражных фільмаў.

Акрамя варшаўскага кінатэатра Muranow, яна будзе паказана 24 кастрычніка ў мінскім Цэнтры сучасных мастацтваў (пазаконкурсная праграма будзе дэманстравацца яшчэ ў Кракаве). У параўнанні з мінулымі фестывалямі праграма выглядае менш насычанай, што тлумачыцца фінансавым складнікам. А калі адысці ад тэхналагічных і лічбавых характарыстык, гэта кіно — так ці інакш голас блізкіх нам людзей, што адлюстроўвае пошукі і праблемы сучаснікаў. «Бульбамуві» — цэлы кінафестываль з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй.

«Андрэй Кудзіненка яшчэ ў 2011 годзе анансаваў наш першы фестываль кароткім і трапным азначэннем, што «беларускае кіно — гэта апартунізм, містыфікацыя і палёты ў космас», — кажа **заснавальнік і арганізатар фестывалю Януш ГАЎРЫЛЮК.** — Але наш форум цікавіць больш «экалагічная» вытворчасць, аўтарскі падыход да рэалізацыі фільмаў. На жаль, аўтараў, якім ёсць што сказаць, мала. Яны таксама нечакана знікаюць, як і з'яўляюцца, але працэс пайшоў і яго не спыніць. Каб трапіць у конкурс, трэба проста быць беларусам. Маладым кіношнікам трэба ездзіць па свеце, глядзець і «нюхаць». Да таго ж аўтарскае кіно — найлепшы сродак, каб замежнікі зразумелі той кавалак зямлі, што ляжыць паміж Польшчай і Расіяй».

Штогод «Бульбамуві» даказвае (чым робіць адказную справу) адну важную рэч — беларускаму кінематографу ёсць што паказаць. І гэта дасягаецца разам з іншымі місіямі фестывалю, якія спадар Януш акрэслівае адназначна: гэта прамоцыя беларускага кіно ў Польшчы, дзякуючы чаму палякі лепш ведаюць нашу краіну, і падтрымка маладых аўтараў. «Гэта патрэбна тым, хто хоча выклікаць у Беларусі Новую хвалю, а палякі могуць падзяліцца сваім досведам. У нашых планах шэраг польска-беларускіх воркшопаў».

У сёлетнім фестывалі тры з адзінаццаці конкурсных карцін — дакументальныя. Гэта «Клапоцкі» Аляксандра Міхалковіча, пра аскета-фатографа з правінцыйнага горада, «Пасха Хрыста» Дар'і Юркевіч пра адзначэнне штогадовага хрысціянскага свята ў царкве (у мінулым годзе карціна рэжысёркі «Баба, Ваня і каза» атрымала на фестывалі «Сярэбраную бульбіну») і «Беларускія гульні» Івана Куракевіча.

З адной з ігравых карцін конкурсу чытачы «Звязды» ўжо знаёмыя — гэта фільм «Пугач» Сяргея Каласоўскага, пяшчотная адсылка да дзяцінства з гадзінніком «Мантана» і жуйкамі «Турба». Ён паказваўся таксама на апошнім адкрытым фестывалі кіно краін СНД, Літвы, Латвіі і Эстоніі «Кінашок» у Анапе. Яшчэ адна карціна — «Адной крыві» Мітрыя Сямёнава-Алейнікава пра двух братоў з рознымі поглядамі на жыццё — атрымала Гран-пры на міжнародным фестывалі фільмаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Let's See ў Вене, дзе ўдзельнічала ў конкурсе разам з 118 іншымі кароткаметражкамі. Размова двух хлопцаў пра сэнс чалавечага існавання адлюстравана ў карціне «Вірус» Васіля Цыбулькі; адносіны любоўнага трохкутніка ў карціне «Музыка ў сярэдзіне» Андрэя Кашперскага і Нэлы Васілеўскай; тэма самагубства ў фільме «Апошні дзень дурнога жыцця» Сяргея Філатава; спроба выявіць вобраз беларуса і Мінска ў стужцы «Амерыкан бой» Мікіты Лаўрэцкага; вобраз краіны, які школьнік спрабуе знайсці на вуліцы, у карціне «Беларусь, якая» Влады Сянковай і Святланы Сакалоўскай; жыхар шматкватэрнага дома, што скардзіцца на кансьержа ў ЖЭС у фільме «Кансьерж» Робэрта Сенекі.

Пазаконкурсная праграма складаецца са свайго роду ўжо пераможцаў. Сёлета «Бульбамуві» пакажа трыумфальны фільм «Скрыжаванне» Настассі Мірашнічэнкі і агульнабеларускі праект «Храпатоп», які ствараўся арт-групай» пад кіраўніцтвам Андрэя Кудзіненкі. Апошняя карціна была ўзнагароджана галоўным прызам у конкурсе кінаальманахаў «Амнібус» на «Кінашоку». У пазаконкурсную праграму таксама ўваходзяць два фільмы маладога рэжысёра Мікіты Лаўрэцкага — «Паэзія» і «Амерыкан бой», італьянская і нямецкая дакументальныя стужкі «Made in BY» і «Касмічны параход з белай капусты» як заходнееўрапейскі погляд на нашу краіну; украінскі фільм «Міна» (у стварэнні карціны ўдзельнічала беларуска Саша Мяснікова) і тры фільмы — пераможцы сёлетняга фестывалю.

«Бульбамуві» адзначае ў гэтым годзе маленькі юбілей. Кожны год фестываль складае праграмы з таго, што створана беларусамі, таму да Януша Гаўрылюка ўзнікла лагічнае пытанне: ці апраўдвае чаканні ўзровень фільмаў?

«Калі параўноўваць з сітуацыяй першых трох гадоў, калі была чорная дзірка, цяпер час ад часу відаць ясныя поясы. Творцы вярнуліся з космасу і бяруць тэмы, што пад рукой, таму карцінка, гук і вобразы не хлусяць. Я спадзяваўся, што сёлета будуць толькі перлы, але прыйшлося расчароўвацца. Часам людзі дасылаюць выпадковыя карціны (з абавязкова манументальнай музыкай), някепскія рэпартажы, але яны падыходзяць для тэлебачання, не для фестывалю аўтарскага кіно. Завальваюць нас дакументальнымі фільмамі пра беларускую вёску: конь, карова, гусі і дзед, які ў камеру расказвае пра тое, як раней было... Па заяўках відаць, што людзі мала глядзяць, хоць гэта бясплатная навука, а трэба ведаць класічныя і сучасныя фільмы, каб ствараць нешта арыгінальнае. Радуе, што ёсць аўтары, якія з кожным годам дасылаюць усё больш цікавыя фільмы, напрыклад Роберт Сенека пачынаў з фільмавага скетча, а сёлета даслаў сучасную гумарыстычную кароткаметражку з невыпадковымі акцёрамі».

Так ці інакш, «чыстыя» фестывальныя праграмы могуць прадставіць уласны твар беларускага кіно: «Пошук гэтага твару адбываецца ўвесь час. Ён ужо недзе ёсць, але ніхто не ведае, дзе. Я перакананы, што ён складаецца з твораў незалежных аўтараў, а не ў архаічнай нацыянальнай кінаіндустрыі. Каб вызначыць твар нашага кіно, павінна ўзнікнуць установа кшталту «Беларускага інстытута кінамастацтва», якая будзе фінансавацца з дзяржаўных сродкаў і займацца выключна кінаадукацыяй, прамоцыяй беларускіх фільмаў у свеце і выдаткоўваннем грошай на аўтарскае кіно».

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

«Андрэй Кудзіненка яшчэ ў 2011 годзе анансаваў наш першы фестываль кароткім і трапным азначэннем, што «беларускае кіно — гэта апартунізм, містыфікацыя і палёты ў космас».

Фільм «Касмічны параход з белай капусты» з пазаконкурснай праграмы.

Дзмітрый Карбышаў,
ГЕНЕРАЛ З ГРАНІТНЫМ СЭРЦАМ

У пачатку лютага 1946 года прадстаўніку савецкай місіі па справах рэпатрыяцыі ў Англіі паведамілі, што яго тэрмінова хоча бачыць паранены канадскі афіцэр, які знаходзіцца ў шпіталі пад Лонданам. Афіцэр, былы вязень канцлагера Маўтхаўзен, даслаў запіску, у якой сцвярджаў, што жадае паведаміць савецкаму прадстаўніку «надзвычай важныя звесткі».

«Дарагі сэр! Буду вельмі абавязаны, калі Вы зможаце паслаць каго-небудзь з Вашага пасольства або з Ваеннай Місіі, каб пабачыць мяне ў 22-м канадскім Генеральным шпіталі, Брэмшот, Сурэй, палата 02, з тым, каб я змог перадаць Вам некаторыя навіны, якія тычацца генерал-лейтэнанта Карбышава, палкоўніка Аманіцкага, палкоўніка Івана Георгіевіча Грыгор'ева і палкоўніка Мікалая Васільевіча Сарокіна, з якімі я быў у лагеры знішчэння Маўтхаўзен (Аўстрыя).

Для таго, каб аблегчыць справу, хачу дадаць, што магу гаварыць па-руску дастаткова добра, каб быць зразумелым.

Шчыра Ваш маёр Р.В. Седан дэ Сэнт-Клер».

Разабрацца з лістом было даручана прадстаўніку ўпаўнаважанага па справах рэпатрыяцыі, адзін з супрацоўнікаў якога, маёр І. Саракапуд, сустрэўся з канадскім афіцэрам.

«Я хачу расказаць вам аб тым, як загінуў генерал-лейтэнант Дзмітрый Карбышаў», — вымавіў маёр, калі савецкі прадстаўнік з'явіўся ў шпіталі.

З рапарта маёра Саракапуда:

«13 лютага гэтага года я з перакладчыкам Загаранскім наведаў канадскага маёра Седана дэ Сэнт-Клера...

Быўшы ваеннаслужачым французскай арміі, (ён) трапіў у палон да немцаў. У палоне, у Араніенбургу, на заводзе Хейнкеля, пазнаёміўся з генерал-лейтэнантам Карбышавым.

Паводле яго слоў, Карбышаву немцы прапаноўвалі супрацоўнічаць з імі. Ён адмовіўся катэгарычна, бо не мог здрадзіць Радзіме. Яму было каля 65 гадоў, ён быў не вельмі здаровы і жыў пры сянчасці. У студзені 1945 года 1000 чалавек палонных з завода Хейнкеля былі адпраўленыя ў лагер знішчэння ў Маўтхаўзен. У іх ліку былі генерал-лейтэнант Карбышаў, яшчэ шэраг савецкіх афіцэраў і маёр Седан дэ Сэнт-Клер.

Па прыбыцці ў Маўтхаўзен іх пакінулі на цэлы дзень на марозе. Апранутыя былі дрэнна, мароз быў каля 12 градусаў. Увечары немцы наладзілі для дастаўленых вязняў халодны душ. Пасля душу ў адных кашулях, споднім і калодках на нагах пастроілі ўсіх на пляцы і пратрымалі тут да 6 гадзін раніцы. З 1000 чалавек, якія прыбылі ў Маўтхаўзен, пасля гэтага 480 чалавек памерлі. Памёр і генерал-лейтэнант Карбышаў (гэта здарылася ў ноч з 17 на 18 лютага 1945 г.)...».

Расказ канадскага ваеннага стаў першай з 1941 года весткай пра Дзмітрыя Міхайлавіча Карбышава. Бо ён тады ў СССР лічыўся зніклым без вестак яшчэ ў самым пачатку вайны.

25 лютага таго ж года рапарт быў накіраваны ў Маскву намесніку ўпаўнаважанага СНК СССР па справах рэпатрыяцыі генерал-лейтэнанту К.Д. Голубеву. Пачаўся дадатковы пошук інфармацыі...

КАДЭТ З НЯДОБРАНАДЗЕЙНАЙ СЯМ'І

Біяграфія Дзмітрыя Міхайлавіча Карбышава не зусім тыповая і шмат у чым не падобная да біяграфій кадравых афіцэраў рускай арміі. На яго жыццё прыпала пяць войнаў першай паловы XX стагоддзя, у тым ліку дзве сусветныя і адна грамадзянская. Ён нарадзіўся ў Омску 135 гадоў таму, 26 кастрычніка 1880 года ў сям'і вайскоўца. У дванаццаць гадоў застаўся без бацькі. Дзяцей — сыноў Уладзіміра і Дзмітрыя — выхоўвала маці. З дзіцячых гадоў Дзмітрый марыў працягнуць дынастыю, распачатую бацькам і дзедам, а таму паступіў у Сібірскі кадэцкі корпус. Аднак, нягледзячы на старанне, праяўленае ў вучобе, лічыўся там сярод «нядобранадзейных». У тую пару моладзь, асабліва ў правінцыі, павальна захаплялася рэвалюцыйнымі ідэямі. Не застаўся ўбаку і брат Уладзімір, які ўрэшце быў арыштаваны «за заклікі да бунту і звяржэння ладу». Уладзімір удзельнічаў у рэвалюцыйным гуртку, створаным у Казанскім універсітэце, разам з яшчэ адным маладым радыкалам — Уладзімірам Ульянавым. Але калі будучага правадыра рэвалюцыі толькі выключылі з універсітэта, то Уладзімір Карбышаў апынуўся ў турме, дзе неўзабаве і памёр.

Сям'я, якая і без таго мела немалыя матэрыяльныя цяжкасці, перайшла ў разрад нядобранадзейных і апынулася пад негалосным наглядам паліцыі. Маці нідзе не магла знайсці працу, а Дзмітрыю, нягледзячы на бліскуча здадзеныя іспыты ў Сібірскі кадэцкі корпус, было адмоўлена ў навучанні за казённы кошт. Два гады ён быў вымушаны спасцігаць навукі самастойна, прыбываючы ў вучылішча толькі для здачы залікаў і пераводных экзаменаў, якія ў брата вальнадумца прымалі з усёй строгасцю. Але, нягледзячы на гэта, працавітасцю і выдатнымі ведамі Дзмітрый у 1894-м заваёўвае права стаць сапраўдным кадэтам. А яшчэ праз чатыры гады выпускаецца з корпуса лепшым у класе, атрымаўшы перавагі пры залічэнні ў Мікалаеўскае ваенна-інжынернае вучылішча. З усіх ваенных спецыяльнасцяў Карбышава больш за ўсё прыцягнула будаўніцтва ўмацаванняў і абарончых збудаванняў.

Час вучобы ў Пецярбургу пралятае незаўважна. І ў кастрычніку 1900-га дваццацігадовы афіцэр адпраўляецца да першага месца службы — у сапёрны батальён, дыслакаваны на паўночным усходзе Кітая, у Маньчжурыі. На далёкім Усходзе ўжо адчуваецца набліжэнне вялікай вайны, спешна ідзе інжынернае абсталяванне будучага тэатра ваенных дзеянняў. Начальнік кабельнага аддзялення тэлеграфнай роты падпаручнік Карбышаў пастаянна ў камандзіроўках, кіруе пракладкай кабельных ліній, будуе тэлеграфныя станцыі ў Ляаяне, Мукдэне, Хуанчэні.

Талент маладога афіцэра ўпершыню ярка выявіўся ў руска-японскую кампанію — Карбышаў умацоўваў пазіцыі, наводзіў масты цераз рэкі, наладжваў сродкі сувязі, праводзіў разведку боем. Вестка аб пачатку вайны з Японіяй заспела яго ў Нікольску-Усурыйскім, дзе Дзмітрый Міхайлавіч удзельнічаў у фарміраванні новай тэлеграфнай роты, якую і павінен быў узначаліць. У сакавіку 1904-га ён разам са сваім падраздзяленнем перасёк мяжу Маньчжурыі і аказаўся на перадавой.

Падрабязных апісанняў яго службы ў перыяд руска-японскай вайны не захавалася. У архівах засталася толькі выпіска з прадстаўлення паручніка Карбышава да ордэна Св. Уладзіміра 4-й ступені з мячамі і бантам. Там сказана, што, «быўшы камандзіраваным для сувязі з Порт-Артурам, аказаўся адрэзаным непрыяцелем, сабраў казачыя пасты і з боем прабіўся да батальёна». За вывад з акружэння салдат з тэхнікай і зброяй Дзмітрый Міхайлавіч і атрымаў сваю першую баявую ўзнагароду. Усяго ж да канца вайны іх будзе яшчэ сем: чатыры ордэны і тры медалі. І гэта за год з невялікім! Выпадак унікальны для ваеннага інжынера ў такім невысокім чыне.

Вайна не толькі загартавала характар Карбышава, яна навучыла яго, у літаральным сэнсе акопнага афіцэра, шанаваць і паважаць салдата, спадзявацца на яго мужнасць, разваротлівасць і кемлівасць, знаходзіць з ім агульную мову, а не проста аддаваць каманды. Гэтае ўменне, якое не ўласціва большасці афіцэраў тых гадоў, але якое так шанавалася пад кулямі, сыграла злы жарт з Дзмітрыем Міхайлавічам пасля заканчэння вайны: у 1906 годзе ён быў вымушаны выйсці ў адстаўку.

Пазней у сваёй аўтабіяграфіі ён так каментаваў гэтую падзею: «Мне было прад'яўлена абвінавачванне ў агітацыі сярод салдат, за што я прыцягваўся да суда таварыства афіцэраў». Пасля гэтага, па законах афіцэрскага гонару, штабс-капітан Карбышаў, нягледзячы на ўсе свае заслугі перад царом і Айчынай, вымушаны быў падаць рапарт аб добраахвотнай адстаўцы. Хоць, калі б факт рэвалюцыйнай агітацыі сярод «ніжніх чыноў» сапраўды быў устаноўлены, справа, думаецца, дайшла б ужо да сапраўднага суда. Не будзем забываць, што краіну ў гэты час узрушвалі рэвалюцыйныя падзеі. Так што, хутчэй за ўсё, палкавое начальства (з падачы жандараў) прыгадала грахі перад рэжымам Карбышава-старэйшага і вырашыла пазбавіцца ад яго брата-афіцэра з «нядобранадзейнай сям'і».

На карысць гэтай версіі сведчыць той факт, што цывільнае жыццё Дзмітрыя Міхайлавіча было нядоўгім: ужо праз год, адразу пасля ўціхамірвання смуты, яму дазваляюць вярнуцца на службу, а ў 1908-м не перашкаджаюць паступленню ў інжынерную акадэмію.

АД ПЕРАМЫШЛІ ДА ПЕРАКОПА

У пачатку лета 1911 года ў чыне штабс-капітана Дзмітрый Карбышаў быў накіраваны ў крэпасць Брэст-Літоўск. Як ужо вопытны ваенны інжынер ён прыняў удзел у будаўніцтве фартыфікацыйных збудаванняў Брэсцкай крэпасці — у якасці кіраўніка работ. Карбышаву даручылі рэканструкцыю VII форта другой лініі крэпасці. У архіве Ваенна-гістарычнага музея артылерыі, інжынерных войскаў і войскаў сувязі Міністэрства абароны Расіі захаваліся чарцяжы праекта форта, распрацаваныя афіцэрам і зацверджаныя генералам Буйніцкім.

Тут, на Трышынскіх могілках Брэста, пахавана першая жонка Дзмітрыя Карбышава — Алісія Карлаўна, якая прыбыла з ім да новага месца службы з Пецярбурга і памерла ў 1913-м, пасля шасці гадоў шлюбу. Помнік з чорнага мармуру з высокім крыжам, устаноўлены Дзмітрыем Міхайлавічам, цудам захаваўся да нашага часу. Тут жа, у Брэсце, адбываецца яго першае, праўда, завочнае знаёмства з будучай жонкай Лідзіяй Васільеўнай Апацкай. Яе бацька служыў начальнікам невялікай чыгуначнай станцыі паміж Оршай і Баранавічамі, а брат аказаўся аднапалчанінам Карбышава. Незадоўга да пачатку Першай сусветнай у адным з лістоў ён распавядаў сястры: «Ёсць у нас два капітаны, адзін бегае за ўсімі жанчынамі, за другім, наадварот, усе жанчыны бегаюць. І не дзіва: адукаваны, выхаваны, не зануда, а вельмі абаяльны. Да таго ж — герой Порт-Артура». Хто б тады мог падумаць, што лёсы маладых людзей перапляце менавіта вайна!

З пачаткам баявых дзеянняў ціхая і сціплая павятовая паненка раптоўна змянілася: запісалася ў сёстры міласэрнасці, паехала на фронт. І яшчэ да канца першага ваеннага года была ўдастоена медаля «За адвагу» на Георгіеўскай стужцы. А ў 1915-м падчас штурму крэпасці Перамышль сярод іншых вынесла з-пад агню і параненага ў нагу капітана Карбышава. Вось так яны пазнаёміліся, а неўзабаве і пажаніліся.

У Брэсцкай крэпасці Дзмітрый Карбышаў прабыў да лістапада 1914-га, калі па яго асабістай просьбе ён быў накіраваны ў дзейную армію. Першую сусветную вайну Карбышаў прайшоў у якасці дывізійнага інжынера 78-й і 69-й пяхотных дывізій, а затым начальніка інжынернай службы 22-га фінляндскага стралковага корпуса. За смеласць і адвагу пры штурме Перамышлі і падчас Брусілаўскага прарыву ён быў узведзены ў падпалкоўнікі і ўзнагароджаны ордэнам Святой Ганны.

Падчас рэвалюцыі падпалкоўнік Карбышаў не кідаўся, а адразу ўступіў у Чырвоную Армію. Ён усё жыццё быў верны сваім поглядам і перакананням, ад якіх не адхрышчваўся. Але лепш за ўсё даць слова самому Дзмітрыю Міхайлавічу. Вось што ён пісаў у аўтабіяграфіі:

«Амаль усю Першую сусветную імперыялістычную вайну мне давялося працаваць у складзе 8-й арміі. У другую палову вайны гэтай арміяй камандавалі такія зубры контррэвалюцыі, як генералы Каледзін і Карнілаў. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі, у ліпені 1917 г., армія была кінута Керанскім у наступленне пад Станіславам, але з прычыны прарыву рускага фронту немцамі пад Тарнопалем вымушана была адступіць.

Усё гэта не прамінула адбіцца на настроі салдацкай масы, і 8-я армія хутка бальшавізавалася».

У лістападзе 1920 года Дзмітрый Карбышаў займаўся інжынерным забеспячэннем штурму Перакопа, поспех якога канчаткова вырашыў зыход грамадзянскай вайны.

ФАШЫСТЫ ВАЙНУ НЕ АБВЯШЧАЮЦЬ...

Да канца 1930-х гадоў Дзмітрый Карбышаў лічыўся адным з найвопытнейшых спецыялістаў у галіне ваенна-інжынернага мастацтва не толькі ў Савецкім Саюзе, але і ў свеце. У 1940-м яму было прысвоена званне генерал-лейтэнанта, а ў 1941-м — ступень доктара ваенных навук.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны генерал Карбышаў працаваў над стварэннем абарончых збудаванняў на заходняй мяжы.

> *«Грамадзянская вайна ў Іспаніі, прарыў лініі Манэргейма, абыход лініі Мажыно, «дзіўная вайна» на Заходнім фронце, падзенне Чэхаславакіі і Аўстрыі, разгром Польшчы, Францыі, Нарвегіі, Данії, Галандыі, Югаславіі, Грэцыі, нястрымнае шэсце нямецка-фашысцкай арміі па Еўропе, — казаў Дзмітрый Міхайлавіч, — усё гэта прымушае пра многае разважаць, па-іншаму глядзець на формы інжынернай падрыхтоўкі дзяржаўных межаў. Наўрад ці хто-небудзь з разважных савецкіх людзей думае, быццам вайна на захадзе нас не тычыцца, што ў нас могуць панаваць мір, цішыня, спакой. Не, мы разумеем, што на самой справе вайна ўжо пачалася і для нас — сапраўдная, жудасная вайна. Бо фашысты вайну не абвяшчаюць».*

А саму Вялікую Айчынную генерал-лейтэнант Дзмітрый Карбышаў сустрэў у Гродне. У пачатку чэрвеня ён быў камандзіраваны ў Заходнюю асобную ваенную акругу, дзе інспектаваў ход будаўніцтва фартыфікацыйных збудаванняў 68-га Гродзенскага ўмацаванага раёна. Такую велізарную па маштабе працу Дзмітрый Міхайлавіч выканаў у незвычайна кароткі тэрмін — усяго за 8 дзён. Ён глыбока разумеў палявую фартыфікацыю і ўмеў цудоўна спалучаць яе з тактыкай і аператыўным мастацтвам войскаў. У яго праекце было паказана размяшчэнне ўсіх батарэй, іх пажаданы калібр і дакладныя месцы размяшчэння, зроблены панарамныя віды на найважнейшыя ўмацаванні — як з непрыяцельскага боку, так і з нашых умацаванняў на непрыяцельскі бераг; напісана грунтоўная тлумачальная запіска і нават кароткі каштарыс на вытворчасць работ.

З пачаткам вайны доты гэтага яшчэ не дабудаванага УРа геаічна адбівалі штурмы ворага, трымаючы абарону да 25 чэрвеня, а асобныя — да 27 чэрвеня, шмат у чым паўтарыўшы подзвіг суседніх пагранічных застаў і абаронцаў слаўнай Брэсцкай крэпасці.

Імклівае наступленне гітлераўцаў паставіла савецкія войскі ў складанае становішча. І 60-гадовы генерал інжынерных войскаў, мабыць, быў, на нечую думку, не самым неабходным чалавекам у часцях, якім пагражае акружэнне: эвакуяваць Карбышава не здолелі. Зрэшты, і ён сам, як сапраўдны баявы афіцэр, вырашыў вырвацца з гітлераўскага «мяшка» разам са сваімі салдатамі.

Гродна пакінулі ў ноч з 22 на 23 чэрвеня 1941 года. Напярэдадні, пра гэта кажуць відавочцы, генерал перадаў свой аўтамабіль з аховай у асобе аўтаматчыка жонцы афіцэра, якую ён сустрэў ля будынка штаба з дзіцем на руках пасля чарговай бамбёжкі. Карбышаў загадаў кіроўцу эвакуяваць яе ў тыл. Перад адыходам з Гродна сапёры ажыццяўлялі падрыў мастоў, складоў з боепрыпасамі, палівам, рознай вайсковай маёмасцю. У кіраўніцтве гэтай работай, без сумнення, прымаў удзел і Дзмітрый Міхайлавіч.

24 чэрвеня разам з групай афіцэраў штаба 3-й арміі ён прыбыў на камандны пункт 10-й арміі, які ў той дзень быў разгорнуты на поўдзень ад Гродна, а 26 чэрвеня — ужо пад Ваўкавыскам. Камандуючы 10-й арміяй генерал Голубеў прыняў фатальнае рашэнне адыходзіць на ўсход дробнымі групамі. Дзмітрыю Міхайлавічу было ўжо больш за шэсцьдзясят, калі ён пешшу, практычна праз усю Беларусь, па лясах і балотах паўтара месяца ішоў з групамі савецкіх войскаў, якія прарываліся з акружэння, камандаваў падчас баёў і навядзенне перапраў, кіраваў інжынерным забеспячэннем шматлікіх прарываў нямецкіх заслонаў.

Вось кароткая хроніка падзей тых дзён, здабытая з розных крыніц, у тым ліку ўспамінаў відавочцаў, аператыўных зводак штаба Заходняга фронту.

22-23 чэрвеня — Карбышаў знаходзіцца ў штабе 3-й арміі генерала Кузняцова (Гродна). Нямецкая 9-я армія генерал-палкоўніка Штрауса (паўночнае крыло групы армій «Цэнтр») атакуе з фронту 3-ю армію, адкідвае яе перадавыя часці і займае Гродна.

24 чэрвеня — Карбышаў з некалькімі афіцэрамі штаба 3-й арміі прыбывае на камандны пункт суседняй 10-й арміі (генерал Голубеў — на поўдзень ад Гродна, перабазіраваўшыся ад Беластока).

25 чэрвеня — аддаўшы частку арміі пад камандаванне генерала Болдзіна, Голубеў атрымлівае загад аб вывадзе асобных часцей 10-й арміі з Беластоцкага выступу на лінію Ліда—Слонім. Але немцы да гэтага моманту ўжо пачынаюць сціскаць кольца вакол Беластоцкага выступу. Акружэнне.

26 чэрвеня — штаб 10-й арміі (Карбышаў тут) ідзе ад Гродна ў бок Ваўкавыска. Голубеў пачынае разумець, што Мінск у руках немцаў (або будзе з хвіліны на хвіліну). Ісці на Мінск сэнсу няма і трымаць перад Мінскам нейкую «лінію» абароны ўжо таксама няма сэнсу. Голубеў прымае рашэнне аб выхадзе з акружэння дробнымі групамі. Куды? Як? Атрымліваецца, куды вочы глядзяць, хто як можа.

Усё. Далей дакладных дакументальных пацвярджэнняў мала. Скажам так, часткі арміі ажыццяўлялі планавы адыход і да 10.00 26.06.1941 г. галовамі калон падышлі да р. Зэльвянкі, пераправы якой былі занятыя праціўнікам. Афіцыйных звестак аб далейшым становішчы часцей не паступала.

Нейкую інфармацыю можна знайсці, у прыватнасці, ва ўспамінах Яўгена Рыгоравіча Рэшына, ваеннага камісара аднаго з інжынерных злучэнняў, які асабіста ведаў генерала Карбышава. Вось як ён расказваў пра сустрэчу чырвонаармейцаў, якія выходзілі з акружэння, з мясцовымі жыхарамі, школьнікамі, што збіралі ў лесе ягады.

«Прыкладна 28-29 чэрвеня 1941 года дзеці заўважылі двух савецкіх камандзіраў. У той час немцы часта скідалі парашутыстаў, пераапранутых у чырвонаармейскую форму, і ў першы момант хлапчукі падумалі, што гэта немцы, і кінуліся бегчы. Тады камандзіры паклікалі іх:

— Хлопцы, не ўцякайце! Мы свае.

Адзін з камандзіраў быў сярэдняга росту, худы, няголены генерал-лейтэнант з эмблемай інжынерных войскаў у пятліцы, другі — высокі, шчыльны чалавек гадоў пад сорак, палкоўнік. Генерал быў у кіцелі, з пісталетам, палкоўнік — у гімнасцёрцы, з аўтаматам ППШ. Перш за ўсё яны папрасілі прынесці ім вады. Генерал сказаў, што яго прозвішча Карбышаў і жартам дадаў, што паходзіць яно ад слова «карабыш» — суслік. І што ён таксама зямлю капае, такая ў яго спецыяльнасць. Хлапчукі добра запомнілі гэтае прозвішча».

ТОЛЬКІ ФАКТ

За гады Другой сусветнай вайны ў нямецкі палон трапілі 83 генералы Чырвонай Арміі. З іх 26 чалавек загінулі па розных прычынах: расстраляныя, забітыя лагернай аховай, памерлі ад хвароб. Астатнія пасля перамогі былі дэпартаваныя ў Савецкі Саюз. З іх 32 чалавекі рэпрэсаваныя (7 павешаны па справе Уласава; 17 расстраляны на падставе загада Стаўкі №270 ад 16 жніўня 1941 г. «Аб выпадках баязлівасці і здачы ў палон і мерах па спыненні такіх дзеянняў» і за «няправільныя» паводзіны ў палоне; 8 прысуджаны да розных тэрмінаў зняволення). Астатнія на працягу паўгода былі звольнены са службы.

Далей было так.

Пару дзён група штаба 10-й арміі адыходзіла на ўсход. Прайшоўшы на поўнач ад Слоніма, дайшлі да шашы Баранавічы — Мінск.

30 чэрвеня. У гэты дзень паспрабавалі перасекчы шашу Баранавічы — Мінск. Але немцы не прапусцілі групу і рассеялі яе. Канчаткова. Застым хтосьці далучыўся да адступаючых пагранічнікаў і рухаўся далей з імі, а хтосьці ўжо ні да кога не далучыўся...

Далей — зноў з успамінаў камісара Рэшына:

«Прыкладна паміж 5 і 10 ліпеня 1941 года ў адным з хутароў, непадалёк ад мястэчка Узда, генерал Голубеў нечакана сустрэў генерала Карбышава і палкоўніка Сухарэвіча. Я пазнаёміўся з Карбышавым і Сухарэвічам — яны таксама пайшлі з намі.

Генерал Карбышаў быў апрануты ў ваенную форму: шэры прагумаваны афіцэрскі плашч, штаны колеру хакі без лампасаў і хромавыя боты генеральскага ўзору. На рамяні праз плячо вісела скураная сумка, у якой, паводле слоў самога Карбышава, знаходзіліся ордэны і асабістыя дакументы.

Сухарэвіч быў у летняй форме і ўзброены аўтаматам ППШ.

Здароўе і настрой генерала Карбышава мне здаліся здавальняючымі. Нягледзячы на свой узрост, ён ні разу не скардзіўся на стомленасць або недамаганне. Наадварот, ён адмовіўся ад прапанаванай намі коннай павозкі і расказаў пра аналагічны выпадак, калі яму давялося выбірацца з акружэння падчас руска-японскай вайны.

Прыкладна праз тыдзень пасля сустрэчы з генералам (16 або 17 ліпеня) Карбышаў у маёй прысутнасці заявіў Голубеву, што не згодны з маршрутам. На яго думку, неабходна рухацца не да Гомеля, а на Магілёў. Усе нашы довады аб перавазе выбранага намі маршруту яго не пераканалі. Разам з палкоўнікам Сухарэвічам яны самастойна павярнулі на Слуцк і далей — на Магілёў. Перад тым, як расстацца, я прапанаваў Карбышаву для прыкрыцця і сувязі з нашай групай узяць некалькі чалавек, але ён рашуча адмовіўся.

У Брэст-Літоўску. 1914.

Мы пайшлі сваёй дарогай і 19 ліпеня выйшлі да Дняпра ў раёне горада Рагачова».

Карбышаў мужна спрабаваў выйсці з акружэння. Спачатку з часцямі РККА ў форме. Затым — практычна ў адзіночку ў цывільным адзенні (ці ў гімнасцёрцы і плашчы без знакаў адрознення). 8 жніўня 1941 года ў непрытомным стане быў узяты ў палон падраздзяленнямі паўднёвага крыла групы армій «Цэнтр».

Цяпер уважліва паглядзім на біяграфію яшчэ аднаго генерала.

Закутны Дзмітрый Яфімавіч. Нарадзіўся ў пасёлку Зімоўнік на тэрыторыі вобласці Войска Данскога ў 1897 годзе. Член ВКП (б) з 1919 года. У Чырвонай Арміі з 1918 года. Генерал-маёр. Камандзір 21-га стралковага корпуса, у камандаванне корпусам уступіў у ліпені 1941 года пасля гібелі генерал-маёра В.Б. Барысава. 26 ліпеня рэшткі корпуса трапілі ў акружэнне ў раёне сёл Вялікая і Малая Зімніца Гомельскай вобласці. Закутны трапіў у палон. Яго дапытвалі спачатку ў штабе корпуса, потым — у штабе 2-й арміі, і нарэшце — у штабе групы армій «Цэнтр».

Як сцвярджаюць сведкі, менавіта Закутны звярнуў увагу нямецкага камандавання на тое, што сярод палонных знаходзіцца генерал Д.М. Карбышаў: «Спяшаюся данесці, — кажа здраднік немцам, — сярод палонных я заўважыў вядомага генерала. Гэта Карбышаў». Аб гэтым можна прачытаць і ў нямецкіх матэрыялах. Вось быў такі выканаўчы дырэктар службы навін Трэцяга рэйха, кіраўнік прэс-дэпартамента міністэрства замежных спраў. Звалі яго Паўль Карл Шміт. Пасля вайны яго не расстралялі, і ён пад псеўданімам Паўль Карэл апублікаваў цэлую серыю кніг па гісторыі вайны, у тым ліку «Напярэдадні «Барбаросы» і «Гітлер ідзе на Усход». У апошняй ён распавядае пра допыты генерала Карбышава, захопленага «за Бярэзінай».

«КАРБЫШАЎ НАЗАЎСЁДЫ ЗАСТАНЕЦЦА КАРБЫШАВЫМ»

Трэба сказаць, што пошукі людзей, названых у лісце канадскага афіцэра Седана дэ Сэнт-Клера, часткова ўвянчаліся поспехам. Сярод іх быў і падпалкоўнік Мікалай Васільевіч Сарокін, якога таксама даставілі ў Маўтхаўзен у лютым 1945-га.

29 красавіка 1946 года ён расказаў следчай камісіі пра тое, што там адбылося, пра зверскую расправу, учыненую фашыстамі. Яго сведчанне пацвярджала словы канадскага афіцэра. Праўда, ён сцвярджаў, што гэтая экзекуцыя (аблівание вязняў вадой на марозе) паўтаралася некалькі разоў. «Апоўначы, сведчыў Сарокін, падчас чарговай такой экзекуцыі таварыш Карбышаў адхіліўся ад напору халоднай вады і ўдарам дубінкі па галаве быў забіты».

Так ці інакш, звесткі аб трагічнай гібелі Дзмітрыя Міхайлавіча сталі праясняцца. І стаў вымалёўвацца шлях генерала па фашысцкіх лагерах.

Генерал-маёр танкавых войскаў М.Ф. Міхайлаў сведчыў: *«У 1942 годзе я быў дастаўлены ў лагер ваеннапалонных за пяць кіламетраў ад Хамельбурга. У той час т. Карбышаў знаходзіўся ў шпіталі. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, напаўгалоднае існаванне (250 г хлеба, 3/4 л супу), Карбышаў быў упэўнены ў перамозе. Карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод камандзіраў і генералаў. У маі 1943 года Карбышава прывезлі ў канцлагер Флосенбург. Неўзабаве мне давялося з ім сустрэцца. Ён расказаў, што з Хамельбургскага лагера яго перавезлі ў Берлін, дзе прапанавалі працаваць на немцаў, але ён катэгарычна адмовіўся. Затым ён быў там жа пасаджаны ў турму, а пазней адпраўлены ў Нюрнбергскі лагер ваеннапалонных. У Флосенбургскім лагеры ён працаваў са мной у каменяломні, па 14 гадзін у суткі цягалі і перавозілі на тачках камяні. Карбышаў хварэў і быў знясілены. Яго ўдалося праз чэшскіх таварышаў пакласці ў шпіталь. Там, знаходзячыся пад страхам быць павешаным ці спаленым у крэматорыі, т. Карбышаў вёў выхаваўчую работу. Быў сам упэўнены ў перамозе нашай Радзімы і ўсяляў гэтую веру савецкім зняволеным...»*

Відавочцы, тыя, што засталіся ў жывых, данеслі да нас і апошнія словы генерала: «Думайце пра Радзіму, і мужнасць не пакіне вас».

У час знаходжання Карбышава ў канцлагеры ўзнікла ідэя змяніць яму прозвішча.

Можна было падабраць з ліку памерлых ваеннапалонных чалавека адпаведнага ўзросту, фізічнага падабенства, біяграфічных звестак і падаць рапарт, пазначыўшы нумар Карбышава. Аднак генерал ад гэтай прапановы катэгарычна адмовіўся, заявіўшы, што Карбышаў заўсёды быў Карбышавым і застанецца ім надалей, што б яму ні пагражала.

КАШТОЎНЫ СПЕЦЫЯЛІСТ

Аўтарытэт Карбышава як ваеннага спецыяліста быў вельмі высокі. Гітлераўцы яшчэ да палону генерала ўнеслі яго ў спіс тых, каго пасля разлічвалі выкарыстаць на службе Трэцяму рэйху.

Нямецкае камандаванне было пераканана: Карбышаў сярод большавікоў — чалавек выпадковы. Дваранін, афіцэр царскай арміі, ён з лёгкасцю пагодзіцца перайсці на іх бок. Урэшце, ён і ў ВКП (б) уступіў толькі ў 1940 годзе, мабыць, пад прымусам.

Аднак вельмі хутка нацысты выявілі, што Карбышаў — моцны арэшак. 60-гадовы генерал служыць Трэцяму рэйху адмаўляўся, выказваў упэўненасць у канчатковай перамозе Савецкага Саюза і нічым не нагадваў чалавека, зламанага палонам.

У сакавіку 1942-га Карбышава перакінулі ў афіцэрскі канцэнтрацыйны лагер Хамельбург. У ім вялася актыўная псіхалагічная апрацоўка высокапастаўленых савецкіх афіцэраў з мэтай прымусіць іх перайсці на бок Германіі. Дзеля гэтага ствараліся самыя гуманныя (калі можна так сказаць пра лагер для ваеннапалонных) умовы. Многія да таго сербанулі ліха ў звычайных салдацкіх лагерах, на гэтым і ламаліся. Карбышаў, аднак, аказаўся зусім з іншага цеста — ніякімі выгодамі і паслабленнямі «перакаваць» яго не ўдалося.

Неўзабаве да Карбышава немцы прыставілі палкоўніка Пеліта. Гэты афіцэр вермахта выдатна валодаў рускай мовай, бо ў свой час служыў у царскай арміі. Больш за тое, Пеліт быў калегам Карбышава падчас працы над фартамі Брэсцкай крэпасці. Ён, тонкі псіхолаг, распісваў перад Карбышавым усе перавагі службы вялікай Германіі, прапаноўваў «кампрамісныя варыянты супрацоўніцтва» — напрыклад, генерал займаецца гістарычнымі працамі аб ваенных аперацыях Чырвонай Арміі ў бягучай вайне, і за гэта яму ў перспектыве дазволяць выезд у нейтральную краіну.

Аднак Карбышаў зноў адхіліў усе прапанаваныя гітлераўцамі варыянты супрацоўніцтва.

Тады нацысты распачалі апошнюю спробу. Генерала перавялі ў адзіночную камеру адной з турмаў Берліна, дзе пратрымалі каля трох тыдняў.

Пасля гэтага ў кабінеце следчага яго чакаў калега — вядомы нямецкі фартыфікатар, прафесар Гейнц Раўбенгеймер. Гітлераўцы ведалі, што Карбышаў і Раўбенгеймер знаёмыя, больш за тое, савецкі генерал з павагай ставіўся да работ нямецкага вучонага.

Раўбенгеймер агучыў Карбышаву наступныя прапановы германскіх уладаў. Генералу прапаноўвалася вызваленне з лагера, магчымасць пераезду на прыватную кватэру, а таксама поўнае матэрыяльнае забеспячэнне. Яму будзе адкрыты доступ ва ўсе бібліятэкі і кнігасховішча Германіі, прадастаўлена магчымасць знаёміцца з іншымі матэрыяламі ў галінах ваенна-інжынернай справы, якія яго цікавяць. Пры неабходнасці гарантавалася любая колькасць памочнікаў для ўладкавання лабараторыі, выканання доследна-канструктарскіх работ і забеспячэння іншых мерапрыемстваў навукова-даследчага характару. Вынікі работ павінны стаць здабыткам нямецкіх спецыялістаў. Усе чыны германскай арміі будуць ставіцца да Карбышава як да генерал-лейтэнанта інжынерных войскаў германскага рэйха.

Немаладому ўжо чалавеку, які прайшоў праз ліхтугі ў лагерах, прапаноўвалі раскошныя ўмовы з захаваннем становішча і нават звання. Ад яго не патрабавалі нават ганьбіць Сталіна і бальшавіцкі рэжым. Гітлераўцаў цікавіла работа Карбышава па яго асноўнай спецыяльнасці.

Дзмітрый Міхайлавіч выдатна разумеў, што гэта, хутчэй за ўсё, апошняя прапанова. Разумеў ён і тое, што абдудзецца ўслед за адмовай.

Аднак мужны генерал сказаў: «Мае перакананні не выпадаюць разам з зубамі ад недахопу вітамінаў у лагерным рацыёне. Я салдат і застаюся верны свайму абавязку. А ён забараняе мне працаваць на тую краіну, якая знаходзіцца ў стане вайны з маёй Радзімай».

Пасля гэтай адмовы гітлераўцы паставілі на генерале крыж, вызначыўшы яго як «перакананага, фанатычнага бальшавіка, выкарыстанне якога на службе Рэйху немагчымае».

Карбышава адправілі ў канцэнтрацыйны лагер Флосенбург, дзе сталі выкарыстоўваць на катаржных работах асабліва цяжкасці. Але і тут генерал здзіўляў сваіх таварышаў па няшчасці нязломнай воляй, сілай духу і ўпэўненасцю ў канчатковай перамозе Чырвонай Арміі.

Адзін з савецкіх палонных пасля прыгадваў, што Карбышаў умеў узняць настрой нават у самыя цяжкія хвіліны. Калі палонныя працавалі над вырабам магільных пліт, генерал заўважыў: «Вось праца, якая дастаўляе мне сапраўднае задавальненне. Чым больш надмагільных пліт патрабуюць ад нас немцы, тым лепш, значыць, ідуць у нашых справы на фронце».

Яго пераводзілі з лагера ў лагер, умовы станавіліся ўсё больш жорсткімі, але зламаць Карбышава не здолелі. У кожным з лагераў, дзе аказваўся генерал, ён станавіўся сапраўдным лідарам духоўнага супраціўлення ворагу. Яго стойкасць надавала сіл тым, хто быў побач.

Фронт каціўся на Захад. Савецкія войскі ўступілі на тэрыторыю Германіі. Выход вайны стаў відавочны нават перакананым нацыстам. У гітлераўцаў не засталося нічога, акрамя нянавісці і жадання расправіцца з тымі, хто аказаўся мацнейшым за іх нават у кайданах і за калючым дротам...

З аповеду канадскага маёра пачаўся збор звестак пра апошнія гады жыцця генерала Карбышава, праведзеныя ў нямецкім палоне. Усе сабраныя дакументы і ўспаміны відавочцаў сведчылі аб мужнасці і стойкасці гэ

НЕРУДПРОМ

НЯПРОСТАЕ ВЫРАШЭННЕ «ПРОСТАЙ» ЗАДАЧЫ

ААТ «Нярудпрам» шукае магчымасці не пакінуць сталіцу і Мінскую вобласць без нярудных будаўнічых матэрыялаў

У працоўным калектыве шмат маладых спецыялістаў. Сярод тых, хто паспяхова працуе на розных участках вытворчасці, — бухгалтар Ганна ХОДАР, эканаміст Святлана БЕНАРАДСКАЯ, намеснік галоўнага бухгалтара Юлія ТРАФІМАВА, вядучы інжынер-механік Максім ШЭЎЧУК, інжынер па якасці Аляксандра СКАЛАБАН, бухгалтар Алена ШПАКОЎСКАЯ, вядучы спецыяліст Сяргей КІРЫНОВІЧ.

З генеральным дырэктарам ААТ «Нярудпрам» Аляксандрам Лойкам з самага пачатку дамовіліся весці гутарку ў канструктыўным ключы — менш гаварыць пра тое, што, дзякаваць Богу, ужо зроблена, а засяродзіць увагу на рэзервах далейшага развіцця, нават на праблемах. Тым не менш кіраўнік палічыў неабходным падкрэсліць:

— Галоўная задача, якую вырашае калектыў, — забеспячэнне будаўнічага комплексу Мінска і сталічнай вобласці пяскамі розных гатункаў, шчэбнем, гравіем. Даём пяскі першага, другога і вышэйшага класа, будаўнікам яны неабходны пад розныя патрэбы. Калі першы і другі клас ідуць на падсыпку ці на «падушку» для дарогі, для аб'ектаў інжынернай інфраструктуры жылых дамоў і на іншыя мэты, то вышэйшы клас і тынковачныя пяскі ў першую чаргу ідуць для прыгатавання разнастайных тэхналагічных растворaў, для аддзелачных работ. Сёлета забяспечылі ўсіх сваіх спажыўцоў пяскамі вышэйшага класа.

Нават просты пералік арганізацый, якія ахвотна бяруць нашу прадукцыю, паказвае, што гэта сапраўды ўвесь будаўнічы комплекс — МАПІД, «Метрабуд», «Макрадар», «Мінскпрамбуд», «Мінскжалезабетон», усе КПД «Мінскбуда», усе будаўнічыя трэсты... Зараз знакаміты салігорскі будтрэст №3 узводзіць «Вялікі камень» і бярэ ў нас патрэбную яму гаму прадукцыі. Усе «Рамаўтадары». Трэст № 15 «Спецбуд». Асфальтавыя заводы. Пералік спажыўцоў вялікі.

І, як перад любым прадпрыемствам, стаіць задача атрымання на гэтай аснове прыбытку. Нашы людзі ганарацца сваім укладам у развіццё рэальнага сектара эканомікі і ў вырашэнне буйных сацыяльных праграм. Бо многія аўтастрады навокал беларускай сталіцы, цэлыя жылыя раёны Мінска ўзведзены ў тым ліку з нашых якасных матэрыялаў. Вось свежы прыклад. Вядзецца будаўніцтва першага этапу другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска. Усе памятаюць, што першы яе ўчастак адкрыў на пачатку кастрычніка Прэзідэнт. Гэта сведчыць пра важнасць аб'екта. Дык вось, пясок найвышэйшага класа на першы этап кальцавой пастаўляем мы, са сваіх драбільна-сартавальных заводаў «Мінскі» і «Крапужына».

— Пытанне, без якога ўсё ж не абысціся: як ідзе выкананне прагнозных паказчыкаў?

— Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва даводзіць нам чатыры асноўныя паказчыкі. Перш за ўсё, рэнтабельнасць продажаў — да канца года павінны на яе выйсці; паказчык энергазберажэння таксама будзе выкананы. Што тычыцца запасаў гатовай прадукцыі, то ў параўнанні з 2010-м ці нават 2012-м гадамі паказчык стаў больш жорсткім, вырас у два разы. На складах павінна быць не 40, як дазвалялася раней, а ўсяго 20 працэнтаў ад сярэднямесячнага аб'ёму. Вельмі разлічваем, што ўмовы надвор'я патрымаюцца спрыяльнымі для будаўнікоў, і яны гэтыя не такія ўжо вялікія запасы разбяруць. Спусціць іх, што называецца, па дэмпінгавых цэнах не можам: цэны і так невысокія. За імі праглядваецца дзяржаўная пазіцыя як міністэрства, так і калектыву, мэта якой — не ўплываць на кошт квадратнага метра жылля.

Суадносіны прадукцыйнасці і зарплаты — гэты паказчык даецца цяжэй за іншыя, яшчэ і таму, што ў канцы кастрычніка заказаў становіцца адчувальна менш, падае выручка. Тут зноў усё залежыць ад умоў надвор'я. Калі летась у снежні «за бортам» было плюс 10, то і вынікі гаспадарчай дзейнасці былі добрымі. Зараз усё робім для таго, каб гэты паказчык выканаць. Складана, бо адзін завод ужо закрываецца, з людзьмі даводзіцца развітвацца, а гэта псіхалагічна цяжэй за ўсё. Частку персаналу — найбольш вопытных, хто даўно ў нас працуе — пераводзім на іншыя заводы, папаўняем змены. Летась пасля выпрацоўкі радовішча мы на паўгода пакінулі людзей на дзве трэціх зарплаты, бо працавалі альбо з не поўнай нагрузкай, альбо наогул не працавалі. Але трымалі спецыялістаў, бо ведалі, што праз паўгода дадуць новае радовішча. Зямлю далі, і сёлета яны атрымліваюць больш за ўсіх, выпрацоўка — максімальная. Але той эксперымент паўтараць нельга, занадта дорага.

— Калі творчая брыгада «Звязды» пабывала на ААТ «Нярудпрам» мінулы раз, у пачатку лютага 2013 года (тады публікацыя называлася «Задача «простая» — даць Мінску і сталічнай вобласці нярудныя будаўнічыя матэрыялы»), нам расказвалі як пра важную падзею пра нараджэнне новага драбільна-сартавальнага завода «Мінскі» — на той час была пушчана яго першая чарга.

— Зараз пушчаны і працуюць усе тры чаргі ДСЗ «Мінскі» ў Лагойскім раёне. На гэтым развіццё не спынілася. Сёлета запусцілі чэшскую ўстаноўку, якая на адходах шламасховішча дае спецыфічны пясок вельмі дробнай фракцыі для падрыхтоўкі сухіх будаўнічых сумесяў. Шырока вядомая кампанія «Хенкель» (сусветны вытворца будаўнічых матэрыялаў) гатова забраць у нас увесь аб'ём гэтай прадукцыі.

Тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы. На нашых радовішчах працуе некалькі перасоўных (мабільных) сартавальных установак. Па плане мадэрнізацыі сёлета павінны былі будавацца паўстацыянарны завод з поўнай прамыўкай прадукцыйнасцю 1 мільён кубаметраў нярудных матэрыялаў. А гэта быў бы значны прарыў у нашым развіцці. Будаваць павінны былі на новым радовішчы, якое аддалі іншым. Так што ўзвядзенне паўстацыянарнага завода, які ў выпадку вытворчай неабходнасці можна «перакінуць» на іншае радовішча, пакуль адкладваецца. А такія паўстацыянарныя прадпрыемствы — справа перспектыўная. Таму што стацыянарны завод стаіць на месцы, і калі радовішча выпрацавана, то сюды пачынаюць вазіць сыравіну з іншага. Але згодна з усімі методыкамі перавозка на адлегласць больш за тры кіламетры ўжо нерэнтабельная.

— Што яшчэ вам удалося зрабіць для мадэрнізацыі вытворчай базы?

— Калі браць гэты год, то набылі новую мабільную ўстаноўку. А да яе пагрузчык, і на падыходзе яшчэ адзін пагрузчык. І бяром яшчэ два горныя бульдозеры, якія выконваюць такія аб'ёмы работ, што іншай тэхнікі не па сілах. Яны дапамогуць нам павялічыць аб'ёмы рэкультывацыі. Завяршаючы работы на любым аб'екце, мы выконваем праграму грунтоўнай рэкультывацыі, у выніку лес зноў становіцца лесам, а поле — полем. Дзяржава нічога не страчвае, бо мы таксама дзяржаўнае прадпрыемства і дбаем пра напаўненне бюджэту.

Сёлета здадзім 80 гектараў пасля рэкультывацыі. І на наступны год столькі ж. Лічу, што ніхто іншы ў Беларусі столькі не здае.

— Калі да вас на заводы і ў кар'еры прыходзіць новая тэхніка, то прыходзяць і новыя тэхналогіі?

— Просты прыклад. Калі разглядаць звычайную стацыянарную сартавальную ўстаноўку, на якіх мы працавалі раней, і новую мабільную ўстаноўку, то яны не ідуць ні ў якае параўнанне. У першым выпадку для абслугоўвання на працягу сутак патрэбна дзесяць чалавек, у другім усяго тры. І не патрэбны затраты на падвоз сыравіны. Мабільная ўстаноўка працуе ў дзве-тры змены і акупляе сябе за год. Праўда, ёсць нюансы. Для мабільнай устаноўкі пры нашых глебах складана рыхтаваць трывалыя пад'язныя шляхі. Патрэбна іх ці ўшчыльняць, ці цэментаваць. І круглы год яе выкарыстоўваць не будзеш, бо ў мінус 15—20 °С не заводзіцца, электроніка і гідраўліка пры нашых маразах не гатовы працаваць. Выхад бачым у мадэрнізацыі.

Так што, нягледзячы на ўсе складанасці пры адаптацыі найноўшых тэхналогій да нашых умоў, за імі будучыня. І мы гатовы ўкладваць сродкі ў далейшую мадэрнізацыю, у новыя тэхналогіі. Пытанне стаіць так: дзе гэта ставіць? Маці-прырода распарадзілася, што

Дырэктару драбільна-сартавальнага завода «Мінскі» Аляксандру МІНЦУ падабаецца размах работ. За яго спінай працуе сучасная мабільная сартавальная ўстаноўка.

На месцы былога кар'ера пасля рэкультывацыі.

ўсе найлепшыя радовішчы пяску знаходзяцца пад раллёй ці пад лесам. І атрымаць іх пад распрацоўку няпроста. Патрэбна знаходзіць кансэнсус адразу з некалькімі інстанцыямі, якія не адразу хочуць разумець, што, па-першае, без нашай прадукцыі ўжо заўтра спыніцца выкананне ўсіх сацыяльных і наогул народнагаспадарчых праграм, якія «завязаны» на рабоце будаўнічага комплексу.

Некаторыя прыватныя прадпрыемствы парушылі найважнейшую ўмову землекарыстання, дзяржава мусіла наводзіць парадак, і пад «раздачу» ў пэўным сэнсе трапілі і мы. Бо ў выніку тэрмін выдзялення новых зямель пад распрацоўку радовішчаў павялічыўся, на гэта ідзе 3-4, а то і 5 месяцаў. Трымаць такі працяглы час людзей без зарплаты, нават на дзве трэці зарплаты, — гэта значыць страціць мільярды для бюджэту і спецыялістаў.

Набліжаецца канец года, і мы, як заўсёды, хутка звернемся да спажыўцоў з просьбай зрабіць заказ нашай прадукцыі на наступны год, з гэтага максімальна канкрэтнага партфеля заказаў будзе складацца бізнес-план прадпрыемства. Ён узгадняецца з міністэрствам, у выпадку неабходнасці будуць зроблены карэкціроўкі. Хутчэй за ўсё ў бок павелічэння. Мы не супраць, калі такія планы падмацоўваюцца прадастаўленнем фронту работ. Калі паглядзець на лічбы, то пятнаццаць гадоў назад прадпрыемства выпускала ўсяго 1 мільён 500 тысяч кубаметраў нярудных матэрыялаў (гэта была гадавая праграма). Па выніках 2014 года было ўжо 4,2 мільёна. Збіраліся выйсці на 5, але два заводы прастаялі без радовішчаў. Потым знізілі тэмп нашы спажыўцы-будаўнікі, і на гэты год мы, хутчэй за ўсё, выйдзем на 3 мільёны кубоў.

— Аляксандр Анатолевіч, давайце высветлім пазіцыі па магчымай рэструктурызацыі вытворчасці. Радовішчы-мільённікі вычарпалі свой рэсурс і закрываюцца. Што замест?

— З 1 кастрычніка гэтага года перастаў дзейнічаць драбільна-сартавальны завод «Заслаўе», закрываецца і кар'ер «Векшычы» там жа, бо радовішча цалкам выбрана. Мы звярталіся ў мясцовы райвыканкам і лясгас, каб нам дазволілі правесці геалагічную разведку зямель побач з заводам — мелася на ўвазе захаваць яго, хаця б таму, што пясок адсюль патрэбен і для другой Мінскай кальцавой дарогі. Але дазволу нам да гэтага часу не далі, бо землі там пад лесам першай катэгорыі. Лясгас у выніку пагадзіўся, а з райвыканкамам працягваецца перапіска. Пакуль што яны нам адказваюць, што не бачаць эканамічнай мэтазгоднасці. І ўсё ж завод пажадана захаваць яшчэ і таму, што тады мы зможам больш паспяхова забяспечыць будматэрыяламі само Заслаўе, якое з'яўляецца горадам-спадарожнікам сталіцы.

На супрацьлеглым баку сталіцы знаходзяцца кар'ер «Ванькаўшчына» і ДСЗ «Волма». Працуюць яны на адным радовішчы, стаяць там дзве ўстаноўкі. Выпрацуюць радовішча ў сакавіку, і ў сакавіку давядзецца закрываць яшчэ адзін завод, калі не будзе працягу на новым участку. Зараз узгадняюцца пытанні па суседнім кар'еры «Ленінскае», але на ім дробныя тынковачныя пяскі, якія патрэбны не ўсім спажыўцам. Там працуе невялікая ўстаноўка, якая не можа даваць дастаткова прадукцыі. А цяпер увага: увесь гэты комплекс з двух радовішчаў і завода забяспечвае буйную прамысловую зону «Шабаны», дзе шмат дамабудаўнічых камбінатаў, асфальтавых заводаў і іншых будаўнічых прадпрыемстваў. Вось у чым складанасць і чаму нас турбуе лёс завода і абодвух кар'ераў. Калі перакрыем гэты вузел, спажыўцам нічога не застанецца, як ехаць на два нашыя заводы, што засталіся — ДСЗ «Мінскі» і ў пяці кіламетрах ад яго ДСЗ «Крапужына». Радовішчамі яны забяспечаны на год. Мы спрабавалі для завода-мільённіка «Мінскі» ўзяць яшчэ некалькі ўчасткаў на агульным радовішчы, каб устанавіць там паўстацыянарны завод. Але рабочая група па гэтым раёне зноў прызнала такое пашырэнне сыравіннай базы эканамічна немэтазгодным.

Такім чынам, агульная карціна такая: заводы закрываюцца, а новыя радовішчы выдзяляюцца ў крайне малых аб'ёмах. Менавіта гэтым перш за ўсё тлумачыцца «спаўзанне» паказчыкаў у рабоце з 4,2 мільёна кубоў да трох, а то і двух у недалёкай перспектыве.

Любое горназдабыўнае прадпрыемства, якім мы з'яўляемся, павінна ведаць свае перспектывы па сыравіннай базе на пяць гадоў наперад (так раней і было), каб дакладна планаваць работу і рыхтаваць вытворчую базу. Апошнім часам нам выдзяляюцца ўчасткі на год. Што можна спланаваць за год? І атрымліваецца так, што радовішчы закрываюцца фактычна ў адзін час, у адзін час закрываюцца заводы па іх перапрацоўцы, і пакуль будуць уведзены новыя, прастой непазбежны. Гэта абумовіць прастоі і сталічнага будаўнічага комплексу. Нам складана тлумачыць перспектыву такога калапсу ў розных кабінетах, але яна абсалютна рэальная.

У той сітуацыі будзе надзвычай складана, нават немагчыма ўтрымаць калектыў — а гэта спецыялісты, гарнякі — і знайсці ці падрыхтаваць новых.

Работы па разведцы радовішчаў мы праводзім працяглы час. Каля трох гадоў назад заплацілі вельмі вялікія сродкі на разведку для сваіх патрэб новых радовішчаў. Патрэбна было рыхтаваць базу для работы на гарады-спадарожнікі. А сёлета нам кажуць, што яно будзе перададзена іншай арганізацыі для будаўніцтва дарожнай развязкі ў Заслаўі.

Як толькі другая кальцавая дарога наблізіцца да Заслаўя, яны ўсё роўна мусяць вазіць матэрыялы з «Мінскага» і «Крапужына». А гэта за 40-50 кіламетраў. Можаце сабе ўявіць, які расход гаручага. Магчыма, нейкі аб'ём возьмуць у прыватніка, кар'еры якога размешчаны бліжэй, але такія аб'ёмы пяску найвышэйшага класа можам даць толькі мы.

Гэтыя прыклады сведчаць аб важнасці знаходзіць і асвойваць сыравінную базу для нашай вытворчасці побач з мегаполісам, гэта ў інтарэсах перш за ўсё нашых спажыўцоў, а значыць, у інтарэсах горада. Бо побач, гэта па-першае. Па-другое, нашы цэны самыя нізкія ў параўнанні з іншымі пастаўшчыкамі пяскоў і іншых будматэрыялаў. Паколькі мы прызнаны манапалістамі, нашы цэны рэгулююцца дзвюма інстанцыямі. Камерцыйная цана — Мінгарвыканкамам, бюджэтная — Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. У выніку на нашу прадукцыю дзве цаны, і яны адрозніваюцца адна ад адной. Мы б'емся, што называецца, каб крыху павялічыць кошт сваёй прадукцыі, але не знаходзім падтрымкі. Нам кажуць зніжаць затраты, што мы і робім за кошт унутраных рэзерваў, і ў нас ёсць рэальнае зніжэнне сабекошту прадукцыі. Але ў руднай прамысловасці моцна не разгонішся: вытворчасць складаная, стратная як па паліве, так і па электраэнергіі.

У гэтай сувязі таксама можна было б сказаць са старонак урадавай і парламенцкай газеты, што ў параўнанні з намі прыватныя горназдабыўныя прадпрыемствы, якія працуюць на тых жа тэрыторыях, даволі часта знаходзяцца ў больш выйгрышным становішчы. На наш погляд, усе павінны знаходзіцца як мінімум у аднолькавых умовах.

Тым не менш стараемся працаваць эфектыўна. Сёлета ні разу не стаялі — не было ні прастояў, ні пераходу на скарочаны працоўны тыдзень. Сёлета былі забяспечаны радовішчамі, і заводы працавалі. Шукаем рэзервы, адпускаем прадукцыю нават дарожнікам.

— Кажуць, у таго, хто хоча працаваць, заўсёды багата праблем. Але ж у вас ёсць на каго абаперціся?

— Сапраўды, мы як бы ў трох гаспадароў. Юрыдычны адрас у горадзе Мінску, значыць, гарадское падпарадкаванне. Кар'еры ў вобласці — і прамая залежнасць ад абласных інстанцый. А ў прамым падпарадкаванні знаходзімся ў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, усе паказчыкі даводзіць нам міністэрства.

Стараемся знаходзіць агульную мову з усімі. Выходзім з таго, што ўсе павінны разумець: мы выконваем дзяржаўную праграму.

Так ці інакш, але ўсе тры інстанцыі дапамагаюць. Мы ў даўгу не застаёмся. Кожны раз, калі атрымліваем новы руднік, даём гораду павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, а значыць, і падаткаў, а вобласці — новыя працоўныя месцы. Бо працуем часта і ў дзве, і ў тры змены. Вобласці таксама дапамагаем машынамі на перыяд пасяўной і ўборкі ўраджаю, абласным дарожным арганізацыям — матэрыяламі. Па просьбах мясцовых жыхароў даглядаем дарогі, чысцім ад снегу, наладжваем дзяжурства бульдозераў і іншай тэхнікі...

Зусім хутка спыняецца яшчэ адзін завод, пра што мы гаварылі вышэй. І трымаць яго калектыў у 100 чалавек на дзве трэці зарплаты ніяк не выпадае.

І яшчэ. Пасля закрыцця двух заводаў на ўвесь Мінск мы зможам даць толькі каля 250 тысяч м³ пяску вышэйшага класа — ці хопіць гэтага для будаўнічага комплексу сталіцы, сказаць не бяруся.

Ці можна ігнараваць дзяржаўныя інтарэсы?

Слова — начальніку вытворча-тэхнічнага аддзела Віктару ЯФІМЕНКУ:

— Прадпрыемства функцыянуе з 1947 года. Закрывае 80 працэнтаў пастаўкі пяскоў, шчэбню і гравію на рынак Мінска і вобласці. Па аб'ёме выпуску прадукцыі на аднаго працуючага нашы паказчыкі не горшыя за еўрапейскія — 10 тысяч кубоў за год.

Пясок, як цэмент і шчэбень, з'яўляецца стратэгічнай сыравінай. Можна дапусціць закрыццё аднаго ці нават некалькіх заводаў КПД, — іх многа. Калі не будзе цэменту, пяску ці шчэбню, усё будаўніцтва проста стане.

«Нярудпрам» усе свае заводы будуе сам, ні рубля бюджэтных сродкаў не бярэ. Адзіная праблема — выдзяленне для дзяржаўных патрэб зямельных участкаў, за карыстанне якімі мы яшчэ і вялікія грошы заплацім.

Падкрэслю: для ДЗЯРЖАЎНЫХ патрэб.

Сорак пяць гадоў працуе Віктар ВАШКАЛАЙ электразваршчыкам на драбільна-сартавальным заводзе «Волма». Павіншаваць яго з гэтай датай сабраліся сябры па працы. Падарунак уручае старшыня прафкама Аляксандр МАСКВА.

Кантакты ААТ «Нярудпрам»
220024, г. Мінск, вул. Асаналіева, 72.
Фінансава-збытавы аддзел — тэл. 398-83-15.
e-mail — nerudprom@mail.by
УНП 100016844

Пагрузка пяску першага класа.

Лічбы вачыма спецыяліста

Начальнік планава-эканамічнага аддзела Вікторыя ЦЯЛЕБА:

— Усё пазнаецца ў параўнанні. Для канкрэтнасці я прывяду некалькі лічбаў, параўнайце іх. На 20.09.2015 года пясок найвышэйшага класа за кубаметр у нас каштуе (з ПДВ) 57 004 рублі, а ў ААТ «Дарбудіндустрыя» — 81 894. Пясок другога класа: у нас 47 287, у іх 61 667. Гравій некаторых фракцый — розніца па цане у два разы!

З КУП «Мінскаблдарбудам» суадносіны па шчэбню асобных фракцый такія: у нас 89 221, у іх 160 043 рублі. Наша пясчана-гравійная сумесь каштуе 19 628, іх — 34 474 рублі.

Я прывяла свае так званыя камерцыйныя цэны, а дзяржаўныя, па якіх мы адпускаем большую частку прадукцыі, яшчэ ніжэйшыя. Вось і выжывай калектыву, як хочаш.

АД РЭДАКЦЫІ. У ходзе падрыхтоўкі матэрыялу пазіцыю кіраўніка актыўна падтрымалі намеснік дырэктара Мікалай Вількот, начальнік вытворчага аддзела Віктар Яфіменка, эканамісты, іншыя работнікі ААТ «Нярудпрам». Дзякуй ім за шчырасць.

Думаецца, што за пазіцыяй кіраўніка стаіць думка ўсяго калектыву ці большасці яго членаў.

А ад сябе дабавім вось што. Безумоўна, ёсць пэўная супярэчнасць паміж любымі прыродаахоўнымі і вытворчымі інтарэсамі. Яна існавала заўсёды. Але без своечасовага выдзялення зямлі таму ж «Нярудпраму» не абысціся: жыллё і дарогі будаваць патрэбна.

Не будзем забываць: руднік на месцы раллі таксама прынясе краіне мільярды рэальных грошай. Магчыма, не меншыя, чым ад паляводства.

Праз некаторы час тут зноў закаласіцца жыта, прырода атрымае сваё назад. Мы пра тое, што кансэнсус, гэта значыць разумны баланс зацікаўленасцяў розных ведамстваў, заўсёды шукаць варта, і чым хутчэй ён будзе знойдзены кожны раз, тым больш карысці для дзяржавы.

Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ. Здымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «РАДИОВОЛНА»

Предмет торгов, краткая характеристика, местонахождение	**Лот №1** Изолированное помещение с инв. № 400/D-89156 общей площадью 3461,1 кв.м, находится в кирпичном капитальном строении 1983 г.п., расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004442 по адресу: г. Гродно, ул. М. Горького, 89. Сдаются в аренду: помещение 398,1 кв.м – срок аренды по 01.11.2015 г., помещение 74 кв.м – срок аренды по 01.12.2015 г.		
Начальная цена	11 922 979 344 рубля с учетом НДС	**Сумма задатка (5%)**	596 148 970 рублей
Сведения о продавце	ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. М. Горького, 89, тел. 8(0152) 437272		
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906		
Срок заключения договора купли-продажи	в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов	**Условия оплаты**	определяются по согласованию сторон
Торги состоятся 29 октября 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 23 октября 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**		
Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте **www.fincentr.by**, телефоны для справок: **8(0152) 77 23 79, 74 49 11**			

Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 11.09.2015 года

ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Наличие инженерных сетей (водоснабжение, электроснабжение), наличие ограничений	Начальная цена, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Расходы по изготовлению документации, бел. руб
1	д. Чуденичи, ул. Строительная-11, кадастровый № 623286308101000386	0,1208		27 418 350	2 741 800	13 269 420
2	д. Чуденичи, ул. Строительная, д. 7, кадастровый № 623286308101000383	0,1199		27 214 050	2 721 400	13 269 420
3	д. Чуденичи, ул. Строительная-16, кадастровый № 623286308101000385	0,1205		27 350 250	2 735 000	13 269 420
4	д. Чуденичи, ул. Строительная-12, кадастровый № 623286308101000387	0,1204		27 327 550	2 732 800	13 626 420
5	д. Чуденичи, ул. Строительная-6, кадастровый № 623286308101000384	0,1202		27 282 150	2 728 200	13 269 420

Аукцион проводится **18 ноября 2015 года в 10.00** в здании Совета, документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, **по 12 ноября 2015 года включительно.** Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» код 153001601. УНН 600537220. Код платежа 04901. Получатель – Острошицкий сельисполком. При себе иметь ксерокопию паспорта и квитанцию об уплате задатка. Победитель обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Телефоны для справок: 801774 57621, 801774 57635.

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот № 1.** **Опель Астра, 1997 г.в., синего цвета, г/н 1303 АХ-2 стоимостью 12 770 100 белорусских рублей**
Собственник (владелец) имущества	**ОДО «Энерготехнохолод» (УНП 811001274)**
Наличие обременений	**отсутствуют**
Местонахождение (адрес) имущества	**Витебская обл., г.п. Бешенковичи, ул. Чапаева, 13**
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**28.10.2015 в 12.00** **г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 318**
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витеблисполкома, 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 34, www.vitebskjust.gov.by Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс (80212) 600071 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 600975
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витеблисполкома № 3642903001037 в филиале 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 27.10.2015 г.** Минимальная величина первого шага — 5 процентов от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

ИЗМЕНЕНИЯ

В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ **ЗАО «Белкоммунстроймонтаж», опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16 строительство 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – ул. Оршанская – ул. Орловская – Смоленский тракт г. Минск:**

«…Стоимость **1 кв.м квартир,** общей площадью **117,82 кв.м** на 11-м этаже составляет **1000 (одна тысяча) долларов США** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90 пн-пт (9.00–18.00, обед 13.00–14.00)

УНП 101019973

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 17 ноября 2015 года торгов с условиями по продаже квартир, принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
№	**Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества**	**Начальная цена, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
1.	Квартира № 3 по адресу: г. Минск, ул. Скрипникова, 44-3 (трехкомнатная, 1 этаж, общая площадь – 72,2 кв. м)	1 045 432 000	104 000 000
2.	Квартира № 39 по адресу: г. Минск, ул. Скрипникова, 44-39 (трехкомнатная, 10 этаж, общая площадь – 72,2 кв. м)	1 055 697 000	105 000 000
3.	Квартира № 4 по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, 19А-4 (трехкомнатная, 1 этаж, общая площадь – 83,1 кв. м)	1 396 085 000	130 000 000

Продавец имущества: ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов после предъявления копии платежных документов о перечислении вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **17 ноября 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.10.2015 по 12.11.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017)207-20-60, (044)777-11-58.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)207-20-60, (044)777-11-58 (ОАО «Минский домостроительный комбинат»).

Извещение о проведении 02 ноября 2015 года повторных открытых аукционных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества детского оздоровительного лагеря «Юный Коммунар»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)
«Спальный корпус» с инвентарным номером 600/С-98138 общей площадью 536,7 кв. м; «Здание дома отдыха (корпус)» с инвентарным номером 600/С-100723 общей площадью 182,0 кв. м; «Здание административного корпуса» с инвентарным номером 600/С-100602 общей площадью 100,3 кв. м; «Здание склада спортинвентаря» с инвентарным номером 600/С-100626 общей площадью 53,9 кв. м; «Здание медпункта» с инвентарным номером 600/С-100718 общей площадью 80,3 кв. м; «Здание котельной, прачечной» с инвентарным номером 600/С-100720 общей площадью 250,3 кв. м; «Здание дома отдыха» с инвентарным номером 600/С-100722 общей площадью 103,8 кв. м; «Здание подстанции» с инвентарным номером 600/С-100619 общей площадью 19 кв. м; «Здание склада» с инвентарным номером 600/С-100616 общей площадью 35,6 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100613 общей площадью 177,7 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100609 общей площадью 174,4 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100612 общей площадью 175,8 кв. м; «Здание насосной станции» с инвентарным номером 600/С-100621 общей площадью 13,2 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100624 общей площадью 174,8 кв. м; «Здание картофелечистки» с инвентарным номером 600/С-100726 общей площадью 29,7 кв. м; «Здание овощехранилища» с инвентарным номером 600/С-100729 общей площадью 125,8 кв. м; «Клуб» с инвентарным номером 600/С-149082 общей площадью 260,3 кв. м; «Спальный корпус» с инвентарным номером 600/С-149077 общей площадью 278,4 кв. м; «Дом сторожа» с инвентарным номером 600/С-149083 общей площадью 34,5 кв. м
Сведения о земельном участке: площадь – 6,3240 га, кадастровый номер 623681700001000204, целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений оздоровительного лагеря «Юный Коммунар»
Местонахождение: Минская область, Минский район, район деревни Крыжовка
Продавец имущества: СОАО «КОММУНАРКА», Республика Беларусь, 220033, г. Минск, ул. Аранская, 18
Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС): 5 022 718 080 белорусских рублей
Сумма задатка: 500 000 000 белорусских рублей
Условия торгов (условия продажи): 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере одного процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. 2. Сохранение функционального назначения продаваемого имущества – оздоровительно-туристический комплекс

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего СОАО «КОММУНАРКА», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **02 ноября 2015 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 20.10.2015 по 29.10.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029)13-11-302 (СОАО «КОММУНАРКА»).

Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(029)13-11-302 (СОАО «КОММУНАРКА»).

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 17 ноября 2015 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания мехмастерской, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Ковалёва, 130, принадлежащего открытому акционерному обществу «Ветковский агросервис» на праве собственности

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%)	Задаток, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%)
1	**Здание мехмастерской, инв. №311/С-46465**	Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Двухэтажное кирпичное строение, 1969 года постройки. Общая площадь 1613,3 м.кв. *Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки.* **Часть здания общей площадью 408,2 м.кв. сдана в аренду сроком до 31.12.2015 г.**	**514 314 000**	**51 000 000**
Земельный участок для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,4428 га** с кадастровым номером 320850100012000127. Имеются ограничения (обременения) прав в использовании земель: **водоохранная зона водного объекта 0,4428 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.				

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 16 ноября 2015 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, в т.ч. индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **17 ноября 2015 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. **Шаг аукциона – 5%.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить объект.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 17 октября 2015 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четырех процентов от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 20 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона.

Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.
☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by
Продавец: ОАО «Ветковский агросервис», Гомельская обл., г. Ветка, ул. Ковалева, 130.
☎ 8 (02330) 2-11-73, 8 (025) 683-13-21

Открытое акционерное общество

«Дорожно-строительный трест № 5»

(г. Минск, ул. Широкая, 26)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 29 октября 2015 года в 11 часов 00 минут ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 4 (конференц-зал).
Форма проведения собрания: очная.
Инициатор созыва: наблюдательный совет.
Основание созыва: решение наблюдательного совета.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за девять месяцев 2015 года.
2. О внесении изменений в устав Общества.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 4, кабинет 12, по рабочим дням с 20 октября 2015 года по 28 октября 2015 года с 8.00 до 17.00 (понедельник–четверг) и с 8.00 до 15.45 (пятница), либо 29 октября 2015 года по месту проведения собрания, тел. для справок: (017) 238 37 12, (024) 970 96 27.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание, состоится 29 октября 2015 года с 09.30 до 10.45 по месту проведения собрания. При себе иметь паспорт, представителю акционера иметь паспорт и доверенность акционера или договор.

Наблюдательный совет ОАО «ДСТ № 5»

УНП 100219908

«ОАО «Белхим»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ

НА ВЫПОЛНЕНИЕ РЕМОНТА ПОЛА ЗДАНИЙ на Минской базе ОАО «Белхим» (п. Колодищи, ул. Чкалова, 58): «Выполнение текущего ремонта пола здания насосной ЛВЖ».

Предложения принимаются **до 14.00 22.10.2015 г.** по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34, каб. №19**. Справки по тел. **8017 204-85-17**, факс **8017 204-85-19**, e-mail: **pto@belhim.by**.

УНП 100122846

19 ноября 2015 г. в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 11 состоится общее собрание акционеров ЗАО «СМУ-77».

УНП 100064641

Государственное учреждение
«Национальный центр интеллектуальной собственности»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ

по определению подрядчика по выполнению текущего ремонта объекта в г. Минске

«Текущий ремонт служебных помещений здания Национального центра интеллектуальной собственности по ул. Козлова, 20, г. Минска (согласно дефектному акту и прилагаемой к нему планировке) (2 этаж)».

Контактные данные: 8(017)3087986.

УНП 191753078

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ 3-Х ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

Организатор аукциона — Жемчужненский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

№ п/п	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Назначение участка	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб.
1	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Озёрная, 1, кадастровый номер 120481503601000419	Участок свободен от застройки. В радиусе 50 м водопровод, газопровод, линия электропередач	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	38573278	3857328	11555048 + расходы на размещение информации в СМИ
2	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Озёрная, 3, кадастровый номер 120481503601000420	Участок свободен от застройки. В радиусе 50 м водопровод, газопровод, линия электропередач	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	38573278	3857328	11346738 + расходы на размещение информации в СМИ
3	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Лазурная, 13, кадастровый номер 120481503601000448	Участок свободен от застройки. В радиусе 50 м водопровод, газопровод	0,1636 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	36482204	3648220	9684429 + расходы на размещение информации в СМИ

1. **Аукцион состоится 19 ноября 2015 года в 15.00 в здании Жемчужненского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, аг. Жемчужный, ул. Ленина, 25.**

2. Условия аукциона:

- наличие не менее двух участников.

3. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 10%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. *Сумма задатка перечисляется до 16 ноября 2015 года до 17.00 на расчетный счет 3604211050007, фил. 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, УНП 200046491. Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, б-р Штоккерау, д. 8 а.*

Получатель: Жемчужненский сельский исполнительный комитет, 225316, Брестская область, Барановичский район, пос. Жемчужный, ул. Ленина, д. 25.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан: оплатить в течение 10 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению государственной регистрации создания земельного участка, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи: каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефонам: (8 0163) 43 16 35, 43 01 36.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни **с 19 октября 2015 года** в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в Жемчужненском сельисполкоме.

Последний день приема документов — 16 ноября 2015 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона — 19 ноября с 14.00 до 15.00.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за земельный участок; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок, подписать соглашение с Жемчужненским сельисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по продаже земельного участка в частную собственность гражданина Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного блокированного жилого дома.

белагропромбанк
традиции будущего

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2015 год	2014 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 287 154	906 285
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		3 280	7 065
4	Средства в Национальном банке	1103		7 274 646	5 019 633
5	Средства в банках	1104		1 121 975	592 399
6	Ценные бумаги	1105		14 765 725	10 163 466
7	Кредиты клиентам	1106		63 398 348	51 246 858
8	Производные финансовые активы	1107		-	1 217
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		929 082	788 288
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		2 572 652	2 247 687
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		69 587	811
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		1 211 992	723 557
14	ИТОГО активы	11		92 634 441	71 697 266
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		5 386 225	2 809 467
17	Средства банков	1202		12 430 905	7 393 576
18	Средства клиентов	1203		55 233 362	43 672 645
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		6 225 819	5 858 217
20	Производные финансовые обязательства	1205		2 713	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		12	-
22	Прочие обязательства	1207		392 615	419 690
23	ВСЕГО обязательства	120		79 671 651	60 153 595
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		8 103 635	6 803 635
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		980 000	934 879
28	Фонды переоценки статей баланса	1214		1 218 451	1 399 067
29	Накопленная прибыль	1215		2 660 704	2 406 090
30	ВСЕГО собственный капитал	121		12 962 790	11 543 671
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		92 634 441	71 697 266

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь–сентябрь 2015 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2015 год	2014 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		8 442 591	7 077 074
2	Процентные расходы	2012		7 141 626	5 401 256
3	Чистые процентные доходы	201		1 300 965	1 675 818
4	Комиссионные доходы	2021		882 888	818 095
5	Комиссионные расходы	2022		185 368	171 863
6	Чистые комиссионные доходы	202		697 520	646 232
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		1 991	215
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(14 569)	(4 978)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		549 690	315 619
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		72 496	6 221
11	Чистые отчисления в резервы	207		791 583	405 042
12	Прочие доходы	208		666 194	805 279
13	Операционные расходы	209		1 651 820	1 688 688
14	Прочие расходы	210		237 802	197 802
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		593 082	1 152 874
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		188 170	239 088
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		404 912	913 786
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22		-	-
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

Председатель Правления А.А.Лысюк

Главный бухгалтер М.А.Шаповалова

Дата подписания «6» октября 2015 г.

**Финансовая отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка: http://www.belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-stand

■ Зорны госць

Алена АМЯЛЮСІК:

«З 365 ДЗЁН У ГОДЗЕ 270 Я ПРАВОДЖУ Ў ДАРОЗЕ»

Як самая тытулаваная веласіпедыстка краіны сумяшчае спорт, вучобу, асабістае жыццё і робіць першыя крокі ў журналістыцы

У свеце веласпорту мы ўсё часцей чуем імёны айчынных спартсменаў, і сёлета яны чарговы раз далі нагоду, каб гаварыць пра іх — заваявалі на чэмпіянаце свету ў Рычмандзе два залатыя медалі. Спачатку Алена Амялюсік перамагла ў камандной гонцы, а затым і Васіль Кірыенка стаў самым лепшым у «індывідуальцы» з раздзельным стартам. Акрамя гэтага, Алена заваявала «золата» першых Еўрапейскіх гульняў у Баку і ліцэнзію на Алімпіяду-2016. Тым самым набыла званне найлепшай шашэйнай велагоншчыцы Беларусі. У адзін з рэдкіх візітаў на радзіму Алена наведала нашу рэдакцыю, дзе расказала пра сваю каманду Velocio-SRAM, родную Бярозу, розніцу паміж італьянскай і беларускай піцай і сваіх падарожжах.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Чытачам «Звязды» ад Алёны

Пра спорт

— Алена, як ацэніце свой сезон?

— Я паказала добрыя вынікі не толькі ў Баку і на сусветным першынстве, але і на этапах Кубка свету. Практычна ўсюды, дзе выступала, была ў шасцёрцы наймацнейшых, у сусветным рэйтынгу цяпер знаходжуся на 10-м радку, таму задаволена сабой і магу назваць гэты сезон самым лепшым у маёй кар'еры.

— Раскажыце пра сваю каманду.

— Я выступаю за нямецкі клуб Velocio-SRAM, у нас вельмі інтэрнацыянальны склад: амерыканка, канадка, дзве аўстралійкі, беларуска, італьянка, французанка і тры немкі. Ужо 4 гады, як я знаходжуся ў прафесійных клубах, але ўпершыню, калі трапіла туды, была вельмі здзіўленая, бо работа там арганізавана зусім па-іншаму. Мой трэнер, немец, не суправаджае мяне на трэніроўках, ён складае толькі графік, па якім я павінна займацца, там распісана ўсё да хвіліны. Я была ў шоку, калі даведалася ўпершыню, што павінна без спынення праехаць 5 гадзін адна. Як? Я ж магу проста звар'яцець ад гэтага... Але прайшло пару месяцаў — і я прывыкла, цяпер ужо гэта мяне не хвалюе.

Пасля кожнай трэніроўкі ўсе свае даныя з асабістага камп'ютара я скідваю трэнеру, ён глядзіць іх, аналізуе і кажа, што добра, што дрэнна, што трэба змяніць.

Пераможны фініш на Еўрапейскіх гульнях.

— Напэўна, тое, пра што вы гаворыце, складана для нашага менталітэту. Хочацца недзе схалтурыць?

— Для нашых спартсменаў, якія прывыклі трэніравацца ў групавым калектыве, дзе настаўнік пастаянна падганяе і кантралюе, вядома, цяжка. Але кожны павінен разумець, для чаго ён трэніруецца. Калі проста так, тады не варта разлічваць на добрыя вынікі.

— У веласпорце часам даводзіцца працаваць не толькі на сябе, але і на сябровак па камандзе. Гэта адбіваецца на адносінах унутры калектыву?

— Не. Мы праводзім каля 70-80 стартаў у сезоне і зразумела, што ўсе гонкі не магу выйграць адна я. У кожнай з нас ёсць свая спецыялізацыя: напрыклад, я не ўмею настолькі добра фінішаваць, як робяць гэта іншыя. Наш спартыўны дырэктар ведае нюансы кожнай дзяўчыны (у камандзе ёсць фінішоры, спрынтары, тэмпавікі). Я ўніверсалка, гэта значыць, што ў шматдзённай гонцы мне больш падыходзіць горны рэльеф. На такіх трасах стаўкі робяць на мяне, і ўся астатняя каманда ў гэты момант працуе на маю перамогу. У гонках, якія праходзяць на раўніне, у дождж, вецер і холад, у лідарах дзяўчаты з больш буйным целаскладам, таму тут ужо я працую на іх.

— Як дзеляцца прызавыя?

— Пароўну, незалежна ад таго, хто выйграў. Таму што ўсе мы ўносім уклад у перамогу.

— На якім рахунку наша краіна ў свеце веласпорту?

— Беларусаў лічаць добрымі сапернікамі, таму што ў нас ёсць такія славутыя гоншчыкі-прафесіяналы, як Кірыленка, Сіўцоў, Гутаровіч, даўно вядомыя не толькі ў Еўропе, але і ў свеце. Усе ведаюць, што мы моцныя і будзем змагацца да апошняга.

— Ці рэальна ў Беларусі правесці буйны велатурнір?

— Вядома, у нас ужо праводзілася міжнародная мужчынская гонка на шашы. Я чула, што ўсё прайшло паспяхова, было шмат гледачоў. Гэта добрая рэклама для нашай краіны.

— Адкуль у вас такое жаданне дапамагаць?

— Я сама была ў такой сітуацыі: у мяне не было ні формы, ні веласіпеда. Бацькі аддавалі апошнія грошы, каб усё гэта купляць, і гэта было найлепшым падарункам на любое свята. Таму цяпер мне прыемна дапамагчы камусьці. Пасля сезона застаецца шмат рэчаў, і я раздаю іх дзецям.

— Вы пачалі весці калонку ў адным з беларускіх выданняў. Навошта?

— Пасля чэмпіянату свету адзін журналіст прапанаваў мне, і гэтая ідэя падалася мне такой класнай, што я з радасцю пагадзілася. Калісьці я нават хацела паступіць вучыцца на журналіста. Мне вельмі цікава пісаць, я ўвесь час думаю над новымі тэмамі. Хочацца, каб людзі ведалі больш пра веласпорт і наогул пра спорт знутры: пра псіхалогію, атмасферу ў камандзе. Нядаўна я была на тэлебачанні, і мне таксама вельмі спадабалася. Захоплівае прамы эфір, гэта практычна жывыя зносіны з гледачамі.

— Пасля заканчэння БДУФК вы яшчэ захацелі асвоіць прафесію юрыста...

— Мне здаецца, ведаць законы вельмі карысна, бо мы сутыкаемся з гэтым кожны дзень. Вучоба пакуль даецца мне складана, бо з 365 дзён у годзе, 270 я праводжу ў дарозе.

— Як вы ставіцеся да таго, што веларух і ў Еўропе, і ў Беларусі набірае абароты?

— Выдатна! Гэта спрыяе папулярызацыі веласпорту і проста карысна для здароўя кожнага чалавека. Калі я бачу, што пракат разрываецца, усе бяруць повары, іх нават не хапае на ўсіх ахвотных, у мяне столькі радасці на душы! Я падарыла веласіпед маме, усё лета яна ездзіла на ім на працу.

— Асабістае жыццё, як і большасць спартсменак, пакідаеце «на потым»?

— Не, спрабую сумяшчаць, але гэта, вядома, цяжка. Мы жывём на вялікай адлегласці адно ад аднаго, вельмі рэдка бачымся. Да Алімпіяды ўсё будзе так, а потым як Бог дасць.

Пра жыццё

— Пасля завяршэння сезона адправіліся адпачываць?

— Так, я вырашыла трохі пападарожнічаць на машыне. Выехала з Італіі, праехала Аўстрыю, спынялася, глядзела, рабіла фота, потым прыехала ў Германію, спынілася ў Лейпцыгу (там знаходзіцца база нашай каманды). Трапіла нават на «Актобэрфэст», але папіць піва не ўдалося: я была за рулём.

«Пасля сезона застаецца шмат рэчаў, і я раздаю іх дзецям».

— Чаму вырашылі падарожнічаць менавіта на машыне?

— Я вельмі люблю кіраваць. Пасля сезона назапашваецца стомленасць, і хочацца проста пабыць сам-насам з сабой, паглядзець краіны, у якіх я шмат разоў была, але асабліва нічога не бачыла.

— Што паспелі зрабіць за тыдзень у Беларусі?

— Перш за ўсё, ажаніць брата *(смяецца)*. У ходзе сезона мне ўдалося толькі адзін раз прыехаць дадому, у Бярозу, таму цяпер стараюся як мага больш часу правесці з сям'ёй.

Ужо па традыцыі наведала свайго трэнера і спартсменаў у родным горадзе. Я заўсёды прывожу ім маленькія падарункі. Цяпер на базе, дзе пачынала займацца, праводзіцца капітальны рамонт, сітуацыя з умовамі там мяняецца ў лепшы бок. Школе падарылі сертыфікат на набыццё некалькіх веласіпедаў. Гэтага, вядома, мала, але хоць штосьці. У Бярозе трэніруецца шмат дзетак не толькі з самога горада, але і ўсяго раёна і найбліжэйшых вёсак, таму роварaў не хапае.

Летась на сустрэчы з уладамі ў Брэсце спыталі, што трэба купіць асабіста мне. А мне нічога не трэба, у мяне ўсё ёсць, таму я папрасіла лепш дапамагчы дзецям.

Пра Італію

— Ужо некалькі гадоў вы жывяце ў Італіі. Як вам краіна?

— Вельмі падабаецца. Там вясёлыя, добразычлівыя людзі, вельмі эмацыйныя. Я сябрую з усімі сваімі суседзямі ў доме (у нас жыве восем сем'яў). Яны, у сваю чаргу, заўсёды хвалююцца і «хварэюць» за мяне. Толькі скончу гонку, адразу прыходзяць sms ад іх; прыязджаю дадому, а яны чакаюць мяне з піцай.

— Італьянская піца моцна адрозніваецца ад беларускай?

— Там яна гатуецца на вельмі тонкім пласце цеста, зверху таматная паста, могуць быць свежыя памідоры і мацарэла. Ніякага маянэзу!

— Калі прыязджаеце дадому, ласуеце кулінарнымі вынаходкамі родных?

— Абавязкова! Тата і брат вельмі любяць, калі я гатую ім лазанню, часта дома раблю самы вядомы і папулярны італьянскі дэсерт — крастата. Італьянцы ядуць яго кожны дзень. Гэта пірог з варэннем і свежай садавіной наверсе. Тата любіць, калі я гатую яму пасту, па-нашаму макарону, з рознымі соусамі і морапрадуктамі.

Гутарыла Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ
lobazhevich@zviazda.by

Даты. Падзеі. Людзі

17 КАСТРЫЧНІКА

1805 год — 210 гадоў з часу нараджэння (Міншчына) Антонія Руткоўскага, педагога, бібліятэкара. Удзельнік паўстання 1830—1831 гг., пасля задушэння якога быў вымушаны эміграваць за мяжу, жыў у Парыжы. Настаўнічаў у эмігранцкіх школах. З 1843-га быў на пасадзе намесніка загадчыка польскай бібліятэкі ў Парыжы, у 1854—1866 — бібліятэкар кнігазбору В. Чартарыйскага, які размяшчаўся ў адным з парыжскіх гатэляў. Апрацоўваў вывезеныя рукапісы і каштоўныя старадрукаваныя кнігі Пулаўскай бібліятэкі. Клапаціўся аб іх захаванасці і рэстаўрацыі, склаў інвентар рукапісаў, кніг, картаў і музейных экспанатаў. Папаўняў бібліятэчныя зборы антыкварыятам. Даваў магчымасць карыстацца каштоўнымі кнігамі чытачам і даследчыкам, забяспечваў іх літаратурай пра родны край, падтрымліваў кантакты з французскімі навукоўцамі. Памёр у 1873 годзе.

1908 год — нарадзіўся (в. Старынцы, цяпер Полацкі раён) Павел Емяльянавіч Купрыянаў, першы беларус, які быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза (1936). З 1929 года ў Чырвонай Арміі, служыў у Беларускай ваеннай акрузе. З кастрычніка 1936-га — удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі на баку рэспубліканцаў, камандзір танка. Вызначыўся пад Мадрыдам, знішчыўшы са сваім экіпажам 2 варожыя танкі, 8 гармат, некалькі дзясяткаў салдат. 9 лістапада таго ж 1936 года ў баі каля парку Касадэль-Кампа на ўскрайку Мадрыда танк Купрыянава быў падбіты і экіпаж загінуў.

1938 год — Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР быў заснаваны медаль «За адвагу». Гэтым жа Указам зацверджана Палажэнне аб медалі, у якое пасля былі ўнесены некаторыя змены ў 1943, 1947 і 1980-м гадах. Ім узнагароджваліся вайскоўцы (прычым як радавы і сяржанцкі склад, так і малодшыя афіцэры) Чырвонай Арміі, ваенна-марскога флоту, памежных і ўнутраных войскаў і іншыя грамадзяне СССР, а таксама і замежныя грамадзяне. З моманту свайго з'яўлення гэтая ўзнагарода стала найвышэйшым савецкім медалём ва ўзнагароднай сістэме СССР (і другой па часе зацвярджэння пасля юбілейнага медаля «XX гадоў РККА») і заставалася такой да распаду Савецкага Саюза. У адрозненне ад многіх іншых медалёў і ордэнаў, якія ўручаліся нярэдка «за ўдзел» або «ў сувязі...», медалём «За адвагу» ўзнагароджвалі выключна за асабісты подзвіг і адвагу, праяўленыя на полі бою. Менавіта таму ён стаў асабліва папулярным і шанаваным сярод франтавікоў і вайскоўцаў.

Было сказана

Максім ТАНК,
народны паэт Беларусі:
«Камнем кідаюць
пасля дружбы,
Пасля кахання і знявагі».

НЕДЗІЦЯЧАЯ ПРЫСТУПКА Ў ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ

Дзіцячая чыгунка імя К.С. Заслонава завяршыла свой юбілейны 60-ы сезон летняй цягніковай практыкі, які традыцыйна доўжыцца з мая па верасень. За гэты перыяд па малой магістралі было перавезена 47 тысяч пасажыраў.

На станцыі «Заслонава» адбылася ўрачыстая лінейка, прысвечаная закрыццю 60-га сезона. Найлепшым навучэнцам былі ўручаны ганаровыя граматы, а самым лепшым выпускнікам — памятныя гадзіннікі ад начальніка Дзіцячай чыгункі. Апроч таго, юныя чыгуначнікі ўпершыню былі ўзнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік дзіцячай чыгункі».

Дзіцячая чыгунка сёння — гэта найперш першая прыступка ў прафесійным карпаратыўным навучанні, якую дзеці праходзяць, займаючыся ў гуртку «Юны чыгуначнік». У маі 2009 года быў адкрыты новы вучэбны цэнтр з профільнымі вучэбнымі класамі і камп'ютарным кабінетам. Заняткі ў ім праводзяцца з кастрычніка па красавік. Юныя чыгуначнікі не толькі знаёмяцца з асноўнымі чыгуначнымі дысцыплінамі, але і засвойваюць шэраг прафесій: праваднік пасажырскага поезда, начальнік поезда, памочнік машыніста і машыніст цеплавоза, дыспетчар, дзяжурны па пераездзе і інш. За час работы вучэбнага цэнтра навучанне ў ім прайшлі больш за тры тысячы юных чыгуначнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЗДАРОЎЕ НА ТАЛЕРЦЫ

Салаты і закускі з рэдзькі

Рэдзька — скарбніца карысных жыватворных рэчываў. У ёй шмат эфірных алеяў, вітаміна С, розных цукроў, біялагічна актыўных злучэнняў. Ёсць у рэдзьцы ёд і рэчывы, якія гібельна дзейнічаюць на шкодныя мікробы. Калій, які ёсць у рэдзьцы, спрыяе вывядзенню з арганізма вады і павараннай солі, што вельмі важна пры лячэнні сардэчна-сасудзістай сістэмы і нырак. Сярод усёй гародніны рэдзька займае першае месца па колькасці калію, магнію і кальцыю. У ёй таксама ёсць жалеза і фосфар. Шчолачныя солі, якія змяшчаюцца ў караняплодах, чысцяць наш арганізм ад ядавітых прадуктаў абмену. У якім бы выглядзе вы ні выкарыстоўвалі рэдзьку (рэзаным або дзёртым), не ешце яе адразу, дайце ёй трохі пастаяць, каб яна страціла некаторыя лятучыя рэчывы, якія надаюць залішнюю вастрыню і горыч, і могуць выклікаць пякотку.

Салата «Вітамінная»

Спатрэбіцца: *1 рэдзька, 1 морква, 250 г белакачаннай капусты, 1 агурок, 1 памідор, соль, зялёная цыбуля і зяленіва на смак. Для запраўкі: алей або смятана, маянэз.*

Рэдзьку і моркву надзерці на тарцы. Капусту тонка нашаткаваць. Агурок нарэзаць тонкімі скрылікамі, а памідор — долькамі, зялёную цыбулю — кольцамі. Усё змяшаць, заправіць салату алеем, смятанай або маянэзам, пасыпаць здробненым зяленівам.

Рэдзька з сырам

Спатрэбіцца: 1 рэдзька, 100 г сыру, 100 г смятаны, соль і часнок.

Рэдзьку надзерці на дробнай тарцы разам з сырам, пасаліць, дадаць здробнены часнок і заправіць смятанай.

Салата з рэдзькай і мясам

У адвольных колькасцях спатрэбіцца: *чорная рэдзька, варыная бялкі яек, варанае мяса (можна курынае), маянэз, рэпчатая цыбуля.*

Рэдзьку надзерці на буйной тарцы, мяса дробна і тонка парэзаць, пасекчы бялкі яек, пасаліць, заправіць маянэзам. Зверху ўпрыгожыць абсмажанай да хрумсткай скарыначкі цыбуляй.

Салата з рэдзькі і языка

Спатрэбіцца: *200 г варанага языка, 250 г рэдзькі, 60 г зялёнай цыбулі, 60 г алею, 20 г гранатавага соку, 1 ч. л. мёду.*

Рэдзьку і вараны язык нарэзаць саломкай, цыбулю здрабніць. Рэдзьку і цыбулю бланшыраваць, адціснуць і падсушыць. Усё змяшаць, пакласці ў салатнік горкай і заправіць сумессю алею з гранатавым сокам, пасыпаць зяленівам.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Як падшыць джынсы

Напэўна, кожны з тых, хто носіць джынсы, сустракаўся з такой праблемай: як пакараціць джынсы, пры гэтым захаваўшы вытворчыя пацёртасці. Прапанаваныя ніжэй спосабы падыдуць толькі прамым або расклёшаным мадэлям.

Спосаб першы. Падыходзіць для тонкіх тканін або ў выпадку, калі ніз часам будзе адварочвацца.

Складаем джынсы пярэднімі палавінкамі адна да адной, а заднімі адпаведна вонкі. Сумяшчаем усе сіметрычныя швы. Паралельна нізу джынсаў адзначаем неабходную (гатовую) даўжыню вырабу і праводзім лінію. Па ёй, не дабаўляючы прыпускаў, адразаем адразу абедзве калашыны. Бярэм адрэзаныя часткі. Ад строчкі адмяраем прыпуск прыкладна 7—10 мм і адразаем. Цяпер выпорваем ніткі. Далей разгортваем прыпуск на падгінанне і абразаем прыпускі на вертыкальных швах, пакідаючы каля 2 мм. Робім гэта для таго, каб мінімізаваць таўшчыню напластаванняў.

Цяпер прымяраем абрэзаныя дэталі да калашыны. Часам атрымліваецца, што абрэзаная дэталь выходзіць даўжэйшай. Гэта адбываецца таму, што джынсы расклёшаныя альбо тканіна са стрэйчам. У любым выпадку трэба паменшыць даўжыню да неабходнай. Калі джынсы з вялікай доляй расцяжэння, то даўжыню гэтай дэталі можна зрабіць меншай за шырыню калашыны (не больш чым на 0,5 см у складзеным выглядзе або на 1 см у аб'ёме), бо строчкай яны зноў расцягнуцца і атрымаецца эфект «расклёшанай спаднічкі». Не забываем зрэзаць лішнія прыпускі на швы. Далей пакінуты намі прыпуск у 0,7—1,0 см запрасоўваем усярэдзіну так, каб след ад строчкі адступаў ад перагібу на 1—1,5 мм. Устаўляем калашыну ў атрыманую «акантоўку» да ўпору, сумяшчаючы вертыкальныя швы. Можна замацаваць шпількамі. Калі неабходна (асабліва для шчыльных тканін), напластаванне швоў можна адбіць малатком, што дазволіць машынцы лягчэй праходзіць гэтыя ўчасткі. І пракладаем аздобную і адначасова замацавальную строчку па старым следзе або на 1 мм вышэй (у некаторых выпадках так нават лепш). Добра адпрасоўваем. Стрэйчавыя тканіны лепш трохі спрасаваць.

Засталіся жывымі дзякуючы суседу

Каля шасці гадзін вечара ў службу «101» паступілі званкі аб пажары ад жыхароў вёскі Вільчашы Іўеўскага раёна.

Да моманту прыбыцця пажарных разлікаў гарэў дах аднапавярховага жылога дома. Там пражывалі жанчына-інвалід 1924 года нараджэння і двое яе сыноў, прычым малодшы з дзяцінства таксама мае праблемы са здароўем. Пажар убачыў сусед Іван Аляхновіч, які рамантаваў адрыну і звярнуў увагу на дым. Ён сказаў жонцы выклікаць выратавальнікаў, а сам накіраваўся да суседскага дома. Агонь ужо разгуляўся ў яго правай частцы, дзе быў маленькі пакой з печкай. Ад высокай тэмпературы ў акне трэснула шыба. Каб зменшыць прыток кісларoду, мужчына закрыў адтуліну старызнай і пабег у другую палову хаты, дзе былі людзі. Разбудзіў 68-гадовага сына гаспадыні і дапамог яму выбрацца на свежае паветра. Затым вынес з дома жанчыну і яе 55-гадовага сына. На дапамогу прыбеглі і аднавяскоўцы.

Вядома, што незадоўга да пажару сюды прыходзіла пажылая суседка, каб пратапіць печ. Верагодна, з адкрытых пячных дзверцаў выпалі вуглі, а ад іх загарэліся дровы, што ляжалі побач. Агонь знішчыў дах, пашкодзіў перакрыцце дома, закурадымлены сцены і маёмасць. Гаспадыня і яе сын-інвалід часова знаходзяцца ў раённай бальніцы, а старэйшаму мужчыну далі прытулак аднавяскоўцы. Як паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, у найбліжэйшы час будзе вырашана пытанне аб далейшым месцы жыхарства пагарэльцаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.40	18.09	10.29
Віцебск	7.32	17.56	10.24
Магілёў	7.30	17.59	10.29
Гомель	7.24	17.58	10.34
Гродна	7.55	18.24	10.29
Брэст	7.53	18.27	10.34

Месяц

Першая квадра 20 кастрычніка. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Веранікі, Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Уладзіміра.*

К. *Люцыны, Марыі, Андрэя, Віктара, Ігната.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+8..+9°С	КІЕЎ	+11..+13°С	РЫГА	+9..+11°С
ВІЛЬНЮС	+6..+8°С	МАСКВА	+7..+9°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+6..+8°С

УСМІХНЕМСЯ

Сабраліся разам пяць сябровак, а гаварыць няма пра што. Таму што сабраліся ўсе.

— Сёмачка, радасць мая! Ты пасля жаніцьбы схуднеў і асунуўся. Яна што, не корміць цябе?!

— Мама, ну што вы такое кажаце, вяселле было толькі ўчора!..

Тры кругі пекла:

1. Запраўляць коўдру ў падкоўдранік.

2. Распакоўваць «чупа-чупс».

3. Мыць засохлую талерку з-пад грэчкі.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.584. Індэкс 63850. Зак. № 4101.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 кастрычніка 2015 года.